

Трэцяга ліпеня, у Дзень незалежнасці краіны, маладзечанцы адзначаць чарговы Дзень горада. Свята абяцае быць асаблівым: сёлета Маладзечну спаўняецца 625 гадоў. СТАР 3



Збіраецеся памяняць старую мэблю на новую альбо з густам абставіць перад наваселлем дом, катэдж ці кватэру? Тады запрашаем разам з намі наведаць адну з фірмовых крам «Маладзечнамэбля». СТАР 5



Падымацца задоўга да світання, цягнуць груваcткія прылады і цэлы дзень сядзець на марозе — што прымушае аматараў рыбалкі ісці на такія «подзвігі»? Як высветлілася, зусім не рыба. СТАР 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 лютага 2013 г. ЧАЦВЕР № 34 (27399) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Міхаіл МЯСНІКОВІЧ:

## «УСЕ БАНКІ ПАВІННЫ ПРАЦАВАЦЬ НА ЭКАНОМІКУ КРАІНЫ»

**Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч прапануе сістэмна вырашаць праблему высокіх працэнтных ставак па банкаўскіх крэдытах. Аб гэтым ён заявіў учора на пасяджэнні калегіі Міністэрства фінансаў, перадае БЕЛТА.**

«Праблему высокіх працэнтных ставак трэба здымаць на сістэмнай аснове і не толькі за кошт бюджэту, дзяржбанкаў і Банка развіцця», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. Тут сваю ролю павінна адыграць і Міністэрства фінансаў. Мінфін павінен больш рэальна і актыўна ўплываць на дзейнасць банкаўскай сістэмы краіны, грашова-крэдытную палітыку, рынак капіталу. «Гэта значыць, не прымаць за аксіёму высокія працэнтныя стаўкі ва ўмовах, якія дыктуюцца банкамі», — падкрэсліў прэм'ер-міністр. Адхіленні на 1 працэнт ад плана па стаўцы фінансавання прыводзяць да страты бюджэту прыкладна на Br300 млрд, заўважыў ён. А між тым у грашова-крэдытнай палітыцы, у бюджэце расходы прапісаны. Калі адбываюцца дадатковыя расходы, некага давядзецца недафінансаваць.

Цяпер на рахунках у недзяржаўных банках размешчана амаль 50 працэнтаў сродкаў у замежнай валюце. «Я лічу, што тут уплыў Міністэрства фінансаў павінен быць адчувальным, — адзначыў прэм'ер-міністр. — Недзяржаўныя камерцыйныя банкі сёння зарабляюць вялікія прыбыткі, іх кіраўнікі атрымліваюць салідныя бонусы за кошт нашай эканомікі, рэальнага сектара і сферы паслуг, за кошт таго, што ў нас ёсць аб'ектыўныя цяжкасці. Думаю, што ў першым квартале 2013 года мы навядзём у гэтай справе парадак, давядзецца, вядома, выкарыстоўваць адміністрацыйны рэсурс. Але ў прынцыпе рэзерваваць валюту і зніжаць крэдытаванне недапушчальна».

Усе банкі павінны працаваць на эканоміку краіны і ў першую чаргу на яе мадэрнізацыю.

Кіраўнік урада нагадаў, што ў бюджэце 2013 года запланавана Br13 трлн на дзяржпадтрымку праектаў у эканоміцы. Гэта складае 11 працэнтаў расходаў бюджэту. Таму сродкі павінны выкарыстоўвацца з максімальнай эфектыўнасцю. «І Мінфін павінен быць зацікаўлены не толькі ў тым, каб гэтыя рэсурсы аддаць правільна на падтрымку адпаведных праектаў, ён павінен быць зацікаўлены і ў стварэнні эфектыўных вытворчасцяў як будучых эфектыўных падаткаплацельшчыкаў», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. Бюджэтную падтрымку атрымаюць тыя, хто яе максімальна эфектыўна выкарыстоўвае. Задача Мінфіна — забяспечыць прыярытэтнае фінансаванне высокаэфектыўных інавацыйных праектаў.

Ацэньваючы работу фінансавай сістэмы краіны ў мінулым годзе, Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што яна была эфектыўнай і адэкватнай макраэканамічнай сітуацыі.

Надзея ЕРМАКОВА:

## «Нацбанк не будзе аднаўляць валютнае крэдытаванне фізічных асоб»

**Нацбанк Беларусі не будзе аднаўляць валютнае крэдытаванне фізічных асоб. Аб гэтым паведаміла ўчора журналістам кіраўнік Нацбанка Надзея Ермакова, перадае БЕЛТА.**

Такім чынам, Нацыянальны банк не падтрымаў ініцыятыву прэм'ер-міністра па аднаўленні валютнага крэдытавання фізічных асоб на будаўніцтва жылля. «Прэм'ер-міністр згадзіўся з намі. Мы вызначылі, што можам крэдытаваць будаўніцтва жылля ў беларускіх рублях», — сказала Надзея Ермакова. Пры гэтым тэарэтычна магчыма вярнуцца да абмеркавання гэтага пытання праз год ці два, дадала яна.

«Сёння няма неабходнасці адмяняць рашэнне аб спыненні валютнага крэдытавання. Шмат праблем было з дэвальвацыяй у насельніцтва», — адзначыла Надзея Ермакова. Яна паведаміла, што магчымасць аднаўлення валютнага крэдытавання фізічных асоб на будаўніцтва жылля Нацбанк абмяркоўваў з кіраўнікамі большасці беларускіх банкаў. Прадстаўнікі банкаў катэгарычна выказваліся супраць такой магчымасці.

«Акрамя таго, навошта нам фарміраваць меркаванне, што наш беларускі рубель ужо нікуды не годны, і толькі, як пішуць на форумах, а таксама некаторыя журналісты, валюта нас выратуе. Нам валюта патрэбна для іншых мэт», — дадала Надзея Ермакова.

На гэтым тыдні дзяржаўныя банкі прымуць рашэнне, як яны будуць крэдытаваць будаўніцтва жылля, паведаміла таксама кіраўнік Нацбанка. Размова ідзе аб крэдытах для маючых патрэбу ў будаўніцтве жылля. «Дзяржаўныя банкі выказалі свае прапановы, як яны будуць крэдытаваць у беларускіх рублях пад больш нізкую стаўку», — адзначыла Надзея Ермакова.

Кіраўнік Нацбанка таксама сказала, што прагноз па зніжэнні стаўкі рэфінансавання да канца года да 13-15 працэнтаў гадавых ніхто не адмяняў. Гэта мэта, да якой трэба імкнуцца, таму што высокія стаўкі — тормаз эканомікі, падкрэсліла яна. Разам з тым спяшацца не трэба ні ў якім разе, неабходна ўлічваць інфляцыю і іншыя эканамічныя паказчыкі, таму што калі прыняць няправільнае рашэнне, сітуацыя можа выйсці з-пад кантролю. «Трэба дзейнічаць акуратна», — упэўнена Надзея Ермакова. Кіраўнік Нацбанка ў якасці станоўчай тэндэнцыі адзначыла зніжэнне і стабілізацыю ставак на рынку міжбанкаўскіх крэдытаў.

■ Сёння — Міжнародны дзень роднай мовы

## НЕПЕРАМОЖНАЕ

*Роднае. Гэта тое, што не пераможа нішто і ніколі. Бо як ні круці і не вылузвайся, ты ўсё адно пачынаешся адтуль, дзе нарадзіўся, сярод каго нарадзіўся. А потым з гэтым выходзіш у свет. Ён можа цябе ламаць, падпарадкоўваць, мяняць. Але там, дзе ты нарадзіўся, табе заўсёды будзе хацецца быць сабой. Хоць там... І таму ніякая вонкавая сітуацыя не можа прымусіць чалавека змяніцца настолькі, каб перастаць хацець быць сабой. Калі толькі чалавек сам не гатовы да таго, што можа адмовіцца ад ўласнага «я», мяняцца ў адпаведнасці з павевамі: ламаць сваё нутро, сваё разуменне, маўленне, нават твар — цяпер жа і гэта не праблема. Але хто хацеў бы жыць у свеце асоб з выключна аднолькавымі тварамі? Ці было б гэта працей?.. Ці было б гэта цікава? Чамусьці гэтыя пытанні апускаюцца, калі разважаюць пра моўную сітуацыю.*

*У кожнай сям'і яна свая. Мае бацькі ніколі не задумваліся, якой гаворкай карыстаюцца паміж сабой. Ім трэба нешта сказаць — яны гавораць. Як гаварылі іх бацькі і як заўсёды казалі ў нашай мясцовасці. Цяпер яны часам удакладняюць: «Мы по-свойму говорым». Удакладняюць, калі іх унучка дзівіцца нейкаму слоўцу, якое не можа пачуць больш нідзе, а толькі ў бабулі і дзядулі. Проста ўнучка жыве ў Расіі. «Ба, ну што такое «пойдэм поемо?» — «От, ну тэбэ...» — усміхаецца бабуля-паляшучка.*

*У нашай сям'і моўная сітуацыя нават не двойчы, а тройчы цікавая. Бо родная гаворка маёй сям'і — паляшуцкая. Я яе чула з дзяцінства. Але калі ў садку ці школе нешта такое, бывала, выдавала, то заўсёды было каму паправіць: «Няправільна». Цяпер разумею, што ўсё якраз-такі і было правільна. З пазіцый маёй сям'і. І цяпер мне ў галаву не прыйдзе папраўляць сваіх бацькоў. Наадварот, апошнім часам я атрымліваю каласальнае задавальненне ад таго, як яны гавораць. Некаму збоку можа падацца, што палескі дыялект гучыць больш цвёрда ў параўнанні з літаратурнай беларускай мовай. Але паслухалі б вы, калі мае бацькі ў вёсцы сустракаюцца са сваякамі — гэта гучыць, як песня: з адметнай пяшчотай і чароўна! Нездарма маскоўская ўнучка ўпадабала паездкі ў вёску: ёсць што паслухаць. І яна прыслухоўваецца, удакладняе асобныя словы. А нядаўна гасцявала ў Мінску і стала задаваць пытанне, чаму я размаўляю не так, як бабуля? Адчула ж! Прыйшла неяк пляменніца да мяне ў рэдакцыю і пачула, як мы размаўляем з калегай. Нейкія словы запомніла, спытала, ці правільна зразумела. І здзівілася: а чаму ў Беларусі столькі варыянтаў маўлення? Дык жа і краіна не малая, кажу. Але ёсць літаратурная мова, на якой пішуць кнігі, газеты. «І сайты?..» Чамусьці гэта яе ўразіла больш за ўсё: «Ну калі сайты, то значыць крутая мова!» Але самым нечаканым вынікам той размовы была яе просьба: «А ты не магла б са мной гаварыць па-беларуску?» Наша дзяўчынка!.. І хто скажа, што роднае не адгукаецца?..*

**Ларыса ЦІМОШЫК.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ:

## «Беларуская мова дазваляе нам уваходзіць у сусветную супольнасць з нацыянальна адметным тварам»

**21 лютага ва ўсім свеце адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы. Таму невыпадкова мы вырашылі сустрэцца з дырэктарам філіяла «Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы» Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Аляксандрам Лукашанцам. Пагутарылі з ім пра лёс роднай мовы, перавагі беларускамоўнасці і магчымыя захады па ўмацаванні пазіцый нацыянальнай мовы ў грамадстве. А напачатку Аляксандр Аляксандравіч, як старшыня Міжнароднага камітэта славістаў, распавёў пра Міжнародны з'езд славістаў, які сёлета будзе прымаць сталіца нашай краіны.**



**— Мы адзначаем Міжнародны дзень роднай мовы, які па ініцыятыве ЮНЕСКА скіраваны на развіццё і падтрымку шматмоўя. На вашу думку, ці можна неяк папулярызаваць беларускую мову, прывіць любоў да яе большай колькасці грамадзян, або працэс гэты стыхійны і яго складана стымуляваць?**

— У першую чаргу Міжнародны дзень роднай мовы накіраваны на падтрымку і захаванне нацыянальных моў і культур у свеце, на забеспячэнне права кожнага чалавека карыстацца роднай мовай у сваёй дзейнасці. Таму і ў нашай краіне святкаванне Міжнароднага дня роднай мовы накіравана пераважна на падтрымку беларускай мовы — нацыянальнай мовы беларускага народа, якая, з'яўляючыся дзяржаўнай мовай краіны, недастаткова запатрабавана як рэальны сродак зносін у важнейшых камунікатыўных сферах.

На маю думку, каб пашырыць выкарыстанне беларускай мовы ў важнейшыя сферы ўжытку, неабходна перш за ўсё строгае выкананне існуючага дзяржаўнага заканадаўства ў моўнай сферы; дзяржаўная падтрымка беларускай мовы і кансалідаваная воля самога грамадства выкарыстоўваць беларускую мову ў сваёй паўсядзённай дзейнасці; фарміраванне ў грамадскай свядомасці стаўлення да беларускай мовы як да важнейшай часткі нацыянальнай культуры і нацыянальнай адметнасці; фарміраванне беларускамоўнай кампетэнцыі грамадства і стварэнне адпаведнага беларускамоўнага фону. Упэўнены, што грамадскі прэстыж беларускай мовы істотна павысіцца, калі мы будзем рэгулярна чуць яе ад аўтарытэтных і паважаных людзей.

**— Вы ўзначальваеце Інстытут мовы і і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы. На вашу думку, у які бок рухаецца сёння наша мова? Яна напаўняецца запазычаннямі, у прыватнасці, русізмамі, або наадварот, вынаходзяцца новыя ўласныя словы?**

— Сёння слоўнікавы склад беларускай мовы інтэнсіўна развіваецца, яна папаўняецца новымі лексічнымі адзінкамі для называння актуальных з'яў рэчаіснасці. Гэтае развіццё ідзе ў рэчышчы тэндэнцый, агульных для сучаснага развіцця ўсіх славянскіх моў. Гэта і непасрэдныя запазычанні з іншых моў, пераважна з англійскай (блог, вэб-сайт, дрыблінг, капірайт, мегабайт і інш.), і стварэнне новых лексічных адзінак за кошт уласных моўных рэсурсаў шляхам словаўтварэння (рэкламшчык, мітынгант, нападальнік, бізнесоўца, мысляр, гутарык і інш.), і вяртанне ў актыўны ўжытак слоў з перыферыі моўнай сістэмы (выстава, сумнеў, аповед і інш.). Хацелася б адзначыць, што, нягледзячы на інтэнсіўнае пранікненне ў слоўнікавы склад беларускай мовы вялікай колькасці іншамоўных слоў, яна на пачатку XXI стагоддзя захоўвае сваю нацыянальную адметнасць і спецыфіку і разам з тым здольна паспяхова абслугоўваць усе камунікатыўныя патрэбы жыцця сучаснага грамадства.

**— Самабытная беларуская мова з'яўляецца адной са славянскіх. Таму сёлета славісты не толькі славянскіх краін, але і ўсяго свету збяруцца разам у беларускай сталіцы...**

— Так, у жніўні 2013 года ў Мінску адбудзецца XV Міжнародны з'езд славістаў, у рабоце якога прымуць удзел вучоныя-славісты з розных краін свету. Увогуле з'езды славістаў — гэта буйнейшыя міжнародныя навуковыя форумы, на якіх абмяркоўваюцца праблемы развіцця і функцыянавання славянскіх моў, славянскіх літаратур, фальклору і культур, іх месца і роля ў сусветнай культуры.

**— Чаму сёлета менавіта Беларусь мае гонар правесці з'езд?**

— Міжнародныя з'езды славістаў рэгулярна праводзяцца кожныя пяць гадоў па чарзе ў славянскіх краінах, пачынаючы з 1929 года. Яны ўжо адбыліся амаль ва ўсіх славянскіх краінах, у тым ліку ў Расіі (Масква, 1958) і ва Украіне (Кіеў, 1982). Два апошнія з'езды праходзілі ў новых славянскіх краінах, якія ўзніклі на тэрыторыі былой Югаславіі: Славеніі (Любляна, 2003) і Македоніі (Охрыд, 2008). СТАР 2

ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ХАРКАВЕЦ, міністр фінансаў:**

***«Стаўка падатку на прыбытак у Беларусі можа знізіцца пры скарачэнні падатковых ільгот: варыянт адмовы ад празмерных залішніх ільгот і зніжэнне стаўкі падатку на прыбытак бачыцца рэальным. Такі падыход дасць магчымасць для развіцця ўсяго рэальнага сектара эканомікі, а не толькі нейкіх выбраных галін. Па нашай ацэнцы, падаткі ў Беларусі абсалютна не перашкаджаюць эканоміцы паспяхова развівацца. І далейшы трэнд па яе якасным паляпшэнні павінен накіроўвацца на пошукі ўнутраных рэзерваў і аптымізацыю яе складнікаў».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.02.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8580,00 | ■ |
| Еўра | 11520,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 285,00 | ■ |
| Укр. грыўня | 1054,77 | ▼ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | – 3° |
| Віцебск | – 3° |
| Гомель | + 1° |
| Гродна | – 4° |
| Магілёў | – 3° |
| Мінск | – 5° |

КОРАТКА

Асноўны міграцыйны абмен Беларусі адбываецца з краінамі СНД. З іх у 2012 годзе ў рэспубліку прыбылі 13 тыс. 455 чалавек, з якіх 87,6 працэнта складаюць грамадзяне, якія прыехалі з Расіі, Украіны і Казахстана. Што датычыцца іншых краін (па-за СНД), то ў мінулым годзе ў Беларусь з іх прыбылі 4 тыс. 585 чалавек, а выехалі 2 тыс. 203.

Банкаўскай карткай можна будзе расплаціцца ва ўсіх новых аб'ектах прыдарожнага сэрвісу Беларусі з 16 чэрвеня 2013 года.

Захваральнасць на вострыя рэспіраторныя інфекцыі ў Беларусі знізілася на 10 працэнтаў у параўнанні з папярэднім тыднем. У структуры захварэлых удзельная вага дзяцей да 18 гадоў склала 53,2 працэнта.

Мінгарвыканкам устанавіў гранічныя максімальныя гандлёвыя надбаўкі на сельгаспрадукцыю: надбаўка на 1 кг бульбы і буракоў не павінна перавышаць Br200, капусты, морквы і цыбулі — Br240, яблыкаў — Br1 тыс., надбаўка на свежыя агуркі, памідоры, бананы, апельсіны і лімоны ўстаноўлена ў памеры 25 працэнтаў.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У БРАЗІЛІІ КАНФІСКАВАЛІ 200 ТЫСЯЧ ПАДРОБЛЕНЫХ ФУТБОЛЬНЫХ МЯЧОЎ

У бразільскім порце Сантус канфіскавалі 200 тысяч падробленых футбольных мячоў, якія павінны былі паступіць у продаж у якасці сувеніраў. Пра гэта са спасылкай на заяву ўлад краіны паведамляе Reuters. Падробленая прадукцыя была дастаўлена ў Бразілію з Кітая, піша A Cidade. Некаторыя мячы былі скапіраваны з мадэлі Jabulani, якая выкарыстоўвалася на чэмпіянаце свету па футболе ў Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы ў 2010 годзе. Размалёўка іншых мячоў імітавала дызайн мадэлі Cafusa, якая будзе апрабавана ў матчах Кубка канфедэрацый, якія адбудуцца ў Бразіліі ў чэрвені 2013 года.

### У ЕЎРОПЕ — «СЕЗОН ПАЛЯВАННЯ» НА АЛМАЗЫ

Узброены напад здзейснены на адзін з буцікаў, якія належаць алмазнаму гіганту De Beers, паведамляюць інфармагенцтвы. Невядомыя напалі на фірменную парыжскую краму, выкраўшы каштоўнасці на агульную суму ў 3 мільёны еўра. Для гэтага рабаўнікам не прыйшлося зрабіць нават стрэлу. Паводле даных паліцыі, зламыснікі абабралі 2 вітрыны і выбеглі праз чорны ход.

Гэта другое буйное рабаванне ў Еўропе за адзін дзень. За некалькі гадзін да парыжскага «рэйду» адбылося дзёрзкае рабаванне ў аэрапорце Бруселя. Кошт украдзеных у аэрапорце Бруселя алмазаў ацэньваецца ў 350 млн еўра.

### ЭПІДЭМІЯ ХРАНІЧНЫХ ХВАРОБ У СВЕЦЕ ВЫКЛІКАНА СЯДЗЯЧАЙ ПРАЦАЙ?

Чым больш чалавек сядзіць, тым вышэй рызыка развіцця хранічнага захворвання. Рычард Розенкранц з Універсітэта Канзаса даследаваў 63048 мужчын 45—65 гадоў. Добраахвотнікі паведамлялі аб наяўнасці або адсутнасці хранічнага захворвання і аб распарадку дня (вучонага цікавіла, колькі тыя сядзелі). Людзей разбілі па групах: тыя, хто сядзеў менш за чатыры гадзіны, якія сядзелі па 4-6 гадзін, па 6-8 гадзін і больш за 8 гадзін. Параўнанне першай і другой групы паказала, што людзі, якія сядзелі больш за 4 гадзіны, часцей мелі рак, дыябет, хваробы сэрца і гіпертанію. Адпаведна, чым больш чалавек сядзеў, тым больш вырастала рызыка хвароб. Гэта асабліва актуальна для офісных работнікаў і вадзіцеляў. Прычым індэкс масы цела, узрост, сацыяльна-эканамічнае становішча, адукацыя нічога не значаць.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### У БРЫТАНСКІМ ПАРЛАМЕНЦЕ КАРМІЛІ КАНІНАЙ?

Са сталовых парламента Вялікабрытаніі канфіскаваны чатыры найменні мясной прадукцыі, якая, магчыма, змяшчае каніну. Пра гэта абвясцілі прадстаўнікі брытанскага заканадаўчага сходу.



Служба арганізацыі харчавання парламентарыяў канфіскавала паўфабрыкаты, якія пастаўляла кампанія-падрадчык. Мясныя вырабы выкарыстоўваліся для падрыхтоўкі страў у 28 сталовых, буфетах, рэстаранах і кавярнях Вестмінстэрскага палаца. У іх сілкуюцца члены Палаты абшчын, Палаты лордаў і супрацоўнікі апарату парламента.

Як адзначаюць брытанскія СМІ, стравы ў сталовых прадаюцца па зніжаных цэнах дзякуючы субсідыям дзяржавы. На гэтыя мэты ў год вылучаецца з казны 6 млн фунтаў (9 млн долараў). Пры гэтым на кожныя 10 фунтаў, выдаткаваных наведвальнікам парламенцкай сталовай, прыпадаюць 7,6 фунта дзяржсубсідыі. Канфіскаваная прадукцыя адпраўлена на экспертызу.

«Мясны скандал» разразіўся ў Еўропе на мінулым тыдні, калі ў выніку экспертызы было ўстаноўлена, што прадукты хуткага прыгатавання з ялавічыны змяшчалі прымесі каніны.




*Учора на веладроме «Мінск-Арэны» стартаваў чэмпіянат свету па веласпорце на трэку, у якім прымаюць удзел каля 260 спартсменаў з 35 краін.*

## ПАЕХАЛІ!



Фота БЕЛТА.

Беларуская зборная на дыстанцыі.

Беларусь упершыню прымае сусветны форум у алімпійскім відзе спорту. Гэта будзе першы чэмпіянат свету па велатрэку ў новым алімпійскім цыкле. Таму ў складзе многіх каманд з'явіцца нямала перспектыўных спартсменаў з прыцэлам на Гульні-2016 у Рыа-дэ-Жанейра.

Напрыклад, новае пакаленне гоншчыкаў прадставіць каманда Вялікабрытаніі, якая дамінавала на лонданскай Алімпіядзе-2012, заваяваўшы 7 залатых медалёў з 10 магчымых. Праўда, у брытанцаў не будзе двухразовай алімпійскай чэмпіёнкі Вікторыі Пэндлтан, якая завяршае кар'еру, а таксама яшчэ аднаго вядомага велагоншчыка, шасціразовага алімпійскага чэмпіёна Крыса Хоя, які спыніў выступленні, але, магчыма, выступіць на Гульнях Садружнасці ў 2014 годзе.

Але і без іх склад зборнай Вялікабрытаніі будзе вельмі значным. У Мінску рыхтуюцца выступіць маладыя «зоркі», алімпійскія чэмпіёны Лондана-2012 Джэйсан Кенні, Філіп Хайндс, Лаура Трот і Дэні Кінг.

Зборная Аўстраліі прыехала на першынство без Аны Мірс, але ўсё роўна, несумненна, будзе прэтэндаваць на некалькі залатых узнагарод.

Настроены на перамогу і прадстаўніцы Кітая Шуан Го і Цзыньцзэ Гон, якія на дваіх заваявалі тры алімпійскія медалі ў Лондане.

Да фаварытаў чэмпіянату свету трэба аднесці таксама спартсменаў з Новай Зеландыі, Германіі і Францыі.

А самай шматлікай будзе каманда з суседняй Расіі, у складзе якой 31 велагоншчык — гэта амаль у два разы больш, чым у брытанцаў і аўстралійцаў.

Беларусь выставіць 11 спартсменаў. У жанчын нашу краіну прадставяць чатыры спартсменкі — Аксана Папко, Алена Дылько, Вольга Масюковіч і Ганна Гулік, якія выступяць у шасці дысцыплінах. У камандную гонку праследавання заяўлены Аксана Папко, Алена Дылько і Вольга Масюковіч. У скрэтч — Аксана Папко. У гонцы па ачках прыме ўдзел Алена Дылько, у омніуме — Вольга Масюковіч. Маладая брастаўчанка Ганна Гулік пазмагаецца ў спрынце і кейрыне.

У беларускую мужчынскую каманду ўключаны сем велагоншчыкаў на чатыры дысцыпліны. У каманднай гонцы праследавання будуць удзельнічаць чэмпіён свету 2008 года Аляксандр Лісоўскі, Алег Агіевіч, Яўген Шамсонаў, Раман Раманаў і запасны Андрэй Снітко. У омніуме за медалі пазмагаецца Раман Цішкоў, у скрэтчы — Антон Музычкін, у гонцы па ачках — Раман Раманаў.

Нагадаем, што лідары жаночай зборнай Беларусі не выступяць на хатнім чэмпіянаце свету. У Вольгі Панарынай — траўма, а ў дачыненні да Таццяны Шаракавай працягваецца расследаванне па факце станоўчай допінг-спробы на чэмпіянаце Еўропы-2012 у літоўскім Паневежысе, дзе спартсменка заваявала «золата» ў омніуме і «бронзу» ў каманднай гонцы праследавання з Аленай Дылько і Аксанай Папко.

Усяго на мінскім форуме разыграюць 19 камплектаў узнагарод — 10 у мужчын і 9 у жанчын.

Чэмпіянат свету працягнецца да 24 лютага. Дзённыя сесіі 20—23 лютага будуць пачынацца ў 13-00, вячэрнія — у 19-00. А ў заключны дзень — суадносна, у 10-00 і 14-00.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

## НАЗНАЧАНЫ ПЕРШЫ НАМЕСНІК КІРАЎНІКА СПРАЎ ПРЭЗІДЭНТА

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка назначыў Мікалая Селіванава першым намеснікам кіраўніка спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Адпаведны ўказ Прэзідэнт Беларусі падпісаў 20 лютага.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

■ Парламенцкі дзённік

## У ВЕНЕ АБМЯРКУЮЦЬ НОВЫЯ ПАГРОЗЫ ЕЎРАПЕЙСКАЙ БЯСПЕЦЫ

**Сёння ў Вене адкрываецца 12-я зімовая сесія Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (ПА АБСЕ). У яе пасяджэнні ўдзельнічае парламенцкая дэлегацыя Беларусі на чале з намеснікам Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Віктарам ГУМІНСКІМ.**

На парадку дня — абмеркаванне рэалізацыі дэкларацыі, прынятай летась у Манака, тэма будучай сесіі асамблеі ў Стамбуле, варыянты рэагавання краін АБСЕ на крызіс у Сірыі, Сахары і Паўночнай Афрыцы, прымежнае супрацоўніцтва, узаемадзеянне інстытутаў АБСЕ ў назіранні за выбарамі і іншыя актуальныя пытанні міжнароднай палітыкі. Удзельнікі пасяджэння выслухаюць справаздачы кіраўнікоў місій назіральнікаў на апошніх выбарах ва Украіне, ЗША, Румыніі і Арменіі.

Беларускія парламентарыі выступяць па асноўных пытаннях парадку дня на пасяджэннях Пастаяннага камітэта асамблеі і трох агульных камітэтаў: па палітычных пытаннях і бяспецы; па эканамічных пытаннях, навуцы, тэхналогіі і навакольным асяроддзі; па дэмакратыі, правах чалавека і гуманітарных пытаннях.

У прэс-службе Палаты прадстаўнікоў паведамілі, што ў рамках спецыяльных дэбатаў удзельнікі форуму абмяркуюць расійскую і французскую ініцыятывы па мадэрнізацыі сістэмы еўрапейскай бяспекі.

Акрамя таго, падчас знаходжання ў Вене запланаваны шэраг двухбаковых сустрэч віцэ-спікера ніжняй палаты беларускага парламента з парламентарыямі замежных краін. Віктар Гумінскі таксама возьме ўдзел у сустрэчы кіраўнікоў парламенцкіх дэлегацый — членаў Арганізацыі дагавора аб калектыўнай бяспецы ў асамблеі, якую будзе праводзіць адказны сакратар Парламенцкай асамблеі АДКБ Пётр Рабухін.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**


*К сведению акционеров ОАО «Витебские ковры»*

**Очередное общее собрание акционеров**

**ОАО «Витебские ковры»**

**состоится 28 марта 2013 г. в 14.00**
**по адресу: г. Витебск, ул. М. Горького, 75.**

Регистрация участников собрания будет производиться в день проведения собрания **с 12.30 до 13.50** по предъявлении документа, удостоверяющего личность, а для представителей акционеров — по доверенности. Список акционеров для регистрации участников собрания составлен по данным реестра акционеров **на 11 марта 2013 г.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Отчет об итогах работы Общества в 2012 году и задачах по обеспечению выполнения показателей прогноза социально-экономического развития на 2013 год.
2. Отчет наблюдательного совета о работе в 2012 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2012 г.
4. Утверждение годового баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2012 год.
5. О распределении чистой прибыли, полученной в 2012 году, и направлениях ее использования в 2013 году.
6. О выплате дивидендов за 2012 год.
7. Выборы членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. О внесении изменений в Устав ОАО «Витебские ковры».
9. Утверждение условий вознаграждения для членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни с 21 по 27 марта 2013 г. (с 10.00 до 16.00) в кабинете специалиста по ценным бумагам.

*Наблюдательный совет ОАО «Витебские ковры».*

УНП 300082076 **Тел. 0212 34 09 47.**



Idea Bank
Отличная идея!

**СОМБЕЛБАНК МЕНЯЕТ ИМЯ**

**13 февраля 2013 года Национальный банк Республики Беларусь зарегистрировал изменение наименования ЗАО «Сомбелбанк» в ЗАО «Идея Банк». Переименование произошло в рамках компании по ребрендингу банка, чтобы подчеркнуть принадлежность к крупной восточноевропейской финансовой группе Getin Holding.**

Банки группы Getin успешно работают под общим брендом «Idea Bank» в Польше, Украине, а теперь и в Беларуси.

В соответствии с постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 13.02.2013 № 89 произведена государственная регистрация изменений, вносимых в Устав данного банка.

Организационно-правовая форма банка остается неизменной. ЗАО «Идея Банк» несет все обязательства перед клиентами по договорам, заключенным ЗАО «Сомбелбанк».

*ЗАО «Идея Банк», лицензия № 25 от 13.02.2013, выдана НБРБ, УНП 807000122*


# «Беларуская мова дазваляе нам уваходзіць у сусветную супольнасць...»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Цяпер падышла чарга і Беларусі, у якой такі з'езд праводзіцца ўпершыню. Гэта важная навуковая і культурная падзея агульнадзяржаўнага значэння, якая дазволіць прадэманстраваць сусветнай навуковай супольнасці дасягненні Рэспублікі Беларусь у гуманітарнай сферы, пазіцыянаваць нашу краіну як самастойную славянскую дзяржаву з арыгінальнай нацыянальнай мовай і літаратурай, багатай гістарычнай спадчынай і ўнікальнай духоўнай культурай.

**— Якія моўныя праблемы разглядаюцца ў дакладах, што прадставілі беларускі бок?**

— Беларускія вучоныя рэгулярна прымаюць удзел у міжнародных з'ездах славістаў. Ужо на першым такім з'ездзе ў Празе ў 1929 годзе з дакладам выступіў вядомы беларускі лінгвіст П. Бузук. У апошнія гады ўдзел беларускіх вучоных у гэтых навуковых форумах стаў асабліва значным. На сёлетнім з'ездзе таксама з дакладамі выступяць беларускія моваведы, літаратуразнаўцы і фалькларысты. Тэматыка іх дакладаў прысвечана розным актуальным праблемам беларускай мовы, літаратуры і культуры, якія разглядаюцца на шырокім славянскім фоне з прыцягненнем фактаў іншых славянскіх моў і літаратур, напрыклад: «Беларуска-іншаславянскія лексічныя ізаглосы на картах Агульнаславянскага лінгвістычнага атласа», «Уплыў кантактных моў на фразеалогію Гродзеншчыны», «Функцыянаванне і ўзаемадзеянне розных славянскіх моў і літаратур у Вялікім Княстве Літоўскім», «Ці існаваў старабеларускі пераклад карана?», «Сучасны беларускі правапіс у кантэксце рускага і польскага ўплываў», «Гутарковае беларускае маўленне ў кантэксце славянскіх моў: ілюзіі і рэаліі» і інш. Хацелася б падкрэсліць, што ўвогуле ў навуковай тэматыцы з'езда шырока прадстаўлена актуальная для беларускай гуманітарнай навукі праблематыка, па якой з дакладамі выступяць не толькі беларускія, але і замежныя вучоныя.

**— Напрыканцы, згадваючы пра Міжнародны дзень роднай мовы, як бы вы акрэслілі, якія перавагі мае чалавек, што размаўляе ў Беларусі па-беларуску?**

— Перш за ўсё хацелася б адзначыць, што чым больш моў наогул ведае чалавек, тым больш магчымасцяў ён мае для рэалізацыі сваіх здольнасцяў. Аднак асаблівасці цывілізацыйнага развіцця грамадства ў XXI стагоддзі дыктуюць неабходнасць падтрымання і захавання якраз нацыянальных гуманітарных каштоўнасцяў, у першую чаргу нацыянальнай мовы. Менавіта на гэта скіраваны і Міжнародны дзень роднай мовы, які з кожным годам усё шырэй адзначаецца ва ўсім свеце.

**Міжнародны з'езд славістаў у Беларусі дазволіць пазіцыянаваць нашу краіну як самастойную славянскую дзяржаву з арыгінальнай нацыянальнай мовай і літаратурай, багатай гістарычнай спадчынай і ўнікальнай духоўнай культурай.**

Таму, па-першае, рэальна двухмоўныя грамадзяне нашай краіны, якія дасканала валодаюць абедзвюма дзяржаўнымі мовамі, бясспрэчна, маюць значна больш магчымасцяў для паспяховай дзейнасці ў самых розных сферах грамадскага жыцця. Па-другое, істотна пашыраецца іх культурнае і інфармацыйнае поле, паколькі ім становіцца даступнай уся інфармацыя, якая мае беларускамоўнае і рускамоўнае ўвасабленне. Аднак самае галоўнае, на мой погляд, тут тое, што, ведаючы і выкарыстоўваючы ў сваёй дзейнасці беларускую мову, нашы грамадзяне атрымліваюць магчымасць дакрануцца да сваёй багатай культурнай і гістарычнай спадчыны, навучыцца ганарыцца сваім мінулым і сучасным, адпавядаць сусветным прыярытэтам нацыянальна-моўнага развіцця ў інфармацыйным грамадстве і з упэўненасцю глядзець у будучыню. Нацыянальная беларуская мова дазваляе захоўваць і зберагаць для нашчадкаў тыя культурныя каштоўнасці, якія назапашаны нашымі папярэднікамі, адчуваць сваю нацыянальную адметнасць і самасвядомасць. Сёння беларуская мова з'яўляецца важнейшым атрыбутам нашай дзяржаўнасці, які дазваляе нашай краіне ўваходзіць у сусветную супольнасць з нацыянальна адметным тварам.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

■ Гучная справа

# «БОМБА» ЛЯ БУДЫНКА КДБ

**Насамрэч гучнай стала крымінальная справа, заведзеная па факце хуліганскіх дзеянняў з выкарыстаннем самаробнага выбуховага прыстасавання ля адміністрацыйнага будынка Упраўлення КДБ Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці. Упраўленне знаходзіцца ў былым губернатарскім палацы на беразе Заходняй Дзвіны. Справу раскрылі. Высветлілася, што выбуховае прыстасаванне зрабіла і прывяла ў дзеянне жанчына 1970 года нараджэння.**

### Мінулай восенню...

— 11 лістапада мінулага года каля 19 гадзін ля адміністрацыйнага будынка ўпраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці быў здзейснены выбух неўстаноўленай прылады. Тады былі выбіты шыбы на двух паверхах будынка, часткова парушана тынкоўка фасаду. Выбух быў вельмі моцны, яго пачулі жыльцы дамоў, якія знаходзяцца непадалёку ад Упраўлення КДБ. Упраўленнем Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці ў той жа дзень была распачата крымінальная справа па частцы 3 артыкула 339 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (асабліва злоснае хуліганства), — нагадвае Уладзімір Шалухін, начальнік упраўлення Следчага камітэта па Віцебскай вобласці. — Па выніках экспертызы стала вядома, што адбыўся выбух прымітыўнай выбуховай прылады. Падчас агляду месца здарэння былі канфіскаваны шматлікія фрагменты гэтай прылады, — кавалкі бляшанкі з-пад энергетычнага напою, клейкай стужкі — іншыя рэчавыя доказы, якія дазваляюць ідэнтыфікаваць асобу, якая ўчыніла злачынства. Праведзеныя экспертныя даследаванні і следчыя дзеянні дазволілі зрабіць выснову аб палавой прыналежнасці падазраванага і наяўнасці ў яго (ці яе) блізкіх пэўнага захворвання.

Паводле слоў следчых, у ходзе ацэнкі канфіскаваных падчас агляду месца здарэння рэчыўных доказаў быў вылучаны шэраг версій. Акрамя таго, былі старанна вывучаны матэрыялы праверак па ўсіх фактах хуліганскіх дзеянняў з выкарыстаннем піратэхнічных прылад у Віцебскай вобласці. У выніку праведзенай работы па вылучаных версіях і вывучэння матэрыялаў праверак у поле зроку следчых трапіла ўраджэнка горада Віцебска, раней судзімая за пашкоджанне маёмасці, хуліганства і крадзяжы, грамадзянка Рэспублікі Беларусь 1970 года нараджэння...

### Хадзіла ў мужчынскім адзенні

Падазраваная працуе рабочай на адным з віцебскіх прадпрыемстваў. Адукацыя — сярэдняя. Захаплялася адным з мужчынскіх відаў спорту. Незамужняя, пражывала з мамай. Апошняя нічога не ведала пра тое, чым займаецца яе дачка.

— Калі шукалі «аўтара» выбуху, правяралі і жанчын, якія раней выкарыстоўвалі піратэхнічныя вырабы, адпрацоўваліся і так званыя «чорныя капальнікі». Таму нельга казаць, што затрымана першая жанчына, якая мела такое небяспечнае «хобі». Пасля выбуху былі затрыманы некалькі чалавек, якія знаходзіліся ў момант выбуху недалёка ад будынка Упраўлення КДБ, — кажа **Ігар ЯЎСЕЕЎ, начальнік УУС Віцебскага аблвыканкама**. — Над раскрыццём крымінальнай справы працавалі каля 150 супрацоўнікаў органаў унутраных спраў (найбольш падрыхтаваных і вопытных), Следчага камітэта і КДБ. Зладжаныя дзеянні дазволілі знайсці вінаватую ў выбуху.

### Дома — цэлы арсенал

У рамках расследавання крымінальнай справы па месцы жыхарства жанчыны неадкладна быў праведзены вобыск. У выніку следчымі УСК Рэспублікі Беларусь па



Віцебскай вобласці і аператыўнымі супрацоўнікамі УУС Віцебскага аблвыканкама былі знойдзены і канфіскаваны: сшытак з запісамі ад рукі аб выбуховых рэчывах і іх прапорцыях, аб спосабах вырабу выбуховых сумесяў, а таксама газетныя выразкі пра рознага роду выбухі, у тым ліку пра выбух у адміністрацыйным будынку Упраўлення КДБ Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці; чатыры аналагічныя канфіскаваным падчас агляду месца здарэння самаробныя выбуховыя прылады, упакаваныя ў бляшанку з-пад энергетычнага напою і піва; каля ста петардаў; пнеўматычны пісталет, палімерныя слоікі; клейкая стужка; розныя сыпкія рэчывы, у тым ліку салетра, іншыя прадметы.

— Прызнанне абвінавачанай сваёй віны павінна быць усебакова праверана і можа быць пакладзена ў аснову абвінавачвання толькі пры пацвярджэнні яго іншымі доказамі, — сказаў начальнік вышэйназванага ўпраўлення. — Дастатковасць наяўных у справе доказаў дазволіла прыцягнуць грамадзянку у якасці абвінавачанай. У дачыненні да яе выбрана мера стрымання ў выглядзе ўтрымання пад вартай.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ Як нас дураць

# КОЛЬКІ КАЎБАСЦЫ «КОЛЦАМІ НЕ ВІЦЦА»...

**Супрацоўнікі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Кастрычніцкага РУУС сталіцы разам з прадстаўнікамі санітарнай службы падчас праверкі інфармацыі, што датычыць адносна незаконнай дзейнасці падпольнага цэха па вытворчасці каўбасных вырабаў, выявілі ў ім адсутнасць элементарных нормаў захавання гігіены. Раскіданыя харчовыя адходы, выпацканая тара і паўсюдны бруд... «Малюнак» дапаўнялі інгрэдыенты прыгатавання каўбасы, натуральнымі ў якіх былі толькі свіная шкурка і вотруб'е.**

...Прадпрыемства па вытворчасці папулярных вараных каўбас 50-гадовы мінчанін разам з жонкай вырашылі адкрыць яшчэ ў 2007 годзе. Арандавалі памяшканні сталовай аднаго з прамысловых прадпрыемстваў па вуліцы Казінца, дзе і размясцілі неабходнае абсталяванне. Аднак на санітарныя нормы прадпрымальнікі... забыліся. Ды і да тэхналогіі вытворчасці паставіліся, паводле інфармацыі Кастрычніцкага РУУС, адмыслова — яшчэ з 2011 года дазвол на вытворчасць вараных каўбас скончыўся. А падаўжаць яго ўладальнікі цэха не спяшаліся. Нягледзячы на шматлікія патрабаванні санэпідстанцыі паказаць ім вытворчыя памяшканні, гаспадары адмаўляліся, матывуючы гэта тым, што, маўляў, пачалася рэканструкцыя... Апроч вышэйназваных парушэнняў, прадпрымальнік указваў недакладны тэрмін захоўвання прадукцыі, «дадаючы» тры лішнія дні. Зараз праверка працягваецца. Прадпрымальніка чакае штраф ад службы санітарнага кантролю.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ПРАВАДНОЕ РАДЫЁВЯШЧАННЕ АДКЛЮЧАЦЬ

**У Беларусі да канца 2014 года будзе адключана праваднное радыёвяшчанне. Аб гэтым паведаміў учора журналістам генеральны дырэктар РУП «Белтэлекам» Сяргей Папкоў, перадае БЕЛТА.**

Праваднное радыёвяшчанне пачнуць адключаць з Гродзенскай і Мінскай абласцей, дадаў гендырэктар. «Паступальна па раёнах мы будзем адключаць праваднное радыёвяшчанне ў Беларусі», — растлумачыў гендырэктар. Поўнасцю адключыць праваднное радыё ў краіне плануецца да канца 2014 года.

Уладальнікам радыёкропак плануецца прадаставіць УКХ-прыёмнікі, з дапамогай якіх можна слухаць Першы нацыянальны канал Беларускага радыё. Адключыць праваднное радыёвяшчанне ў Беларусі плануецца ў сувязі з тым, што такая тэхналогія перадачы інфармацыі састарэла. Акрамя таго, рэнтабельнасць гэтай паслугі для нацыянальнага аператара электрасувязі пакідае жадаць лепшага.

## КУЛЬТУРНЫ ГОРАД МАГІЛЁЎ

**Абласному цэнтру ўручылі сертыфікат «Культурная сталіца СНД». Адбылося гэта 20 лютага на ўрачыстым сходзе ў Палацы культуры Магілёўскай вобласці.**

На прэс-канферэнцыі з нагоды гэтай падзеі намеснік міністра культуры Беларусі Тадэвуш Стружэцкі выказаў меркаванне, што рэалізацыя ў Магілёве праекта «Культурная сталіца СНД» дазволіць прыцягнуць сюды больш турыстаў. Так ужо адбылося з іншымі беларускімі гарадамі, якія былі абраны культурнымі сталіцамі мінулымі гадамі.

Намеснік старшыні Выканаўчага камітэта СНД Тактасын Бузубаеў адзначыў, што культурнае супрацоўніцтва на постсавецкай прасторы атрымала новы імпульс. Праект "Культурная сталіца СНД" павінен садзейнічаць паляпшэнню сувязяў паміж краінамі Садружнасці, стварэнню спрыяльнага клімату для эканамічнага і палітычнага супрацоўніцтва.

У Магілёве плануюць сёлета правесці шмат культурных мерапрыемстваў і міжнародных фестываляў. Мяркуецца, што і самі жыхары горада не застануцца абыякавымі да высокага звання і будуць імкнуцца, каб Магілёў стаў дастойнай культурнай сталіцай Беларусі і СНД.

**Ул. інф.**

## СУПРАЦЬ СНЕГАПАДАЎ — АСОБНЫ ПЛАН

**У Мінску, а таксама ў Мінскай і Віцебскай абласцях уведзены план «Надвор'е» ў сувязі з моцнымі снегападамі: сіноптыкі прагназуюць іх узмацненне ў бліжэйшыя дні.**

Супрацоўнікамі ДАІ арганізаваны кругласутачны маніторынг стану вулічна-дарожнай сеткі з мэтай своечасовага выканання дарожнымі і камунальнымі службамі работ па ўборцы снегу і прэвентыўных мерапрыемстваў па ліквідацыі зімовай слізкасці. У выпадку неабходнасці арганізуецца суправаджэнне снегаўборачнай тэхнікі. ДАІ заклікае кіроўцаў захоўваць правілы паркоўкі і не пакідаць аўтамабілі на краі праезнай часткі, каб не перашкаджаць нармальнаму руху транспарту і працы снегаўборачнай тэхнікі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## НА ЭКСПЕРТЫЗУ — КОЖНАГА ЗДАБЫТАГА ДЗІКА

**Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь нагадала пра неабходнасць правядзення абавязковай ветэрынарнай экспертызы ўсіх туш дзікоў, здабытых падчас палявання. Спажываць у ежу мяса дзічыны да атрымання трыхінеласкапічнага даследавання нельга.**

— Аналіз успышак трыхінелёзу ў снежні мінулага года ў Шчучынскім раёне Гродзенскай вобласці, калі пацярпелі 17 чалавек, і ў студзені гэтага ў Мінску, калі пацярпелі 5 чалавек, паказвае, што кантрольнаму даследаванню падвяргаліся не ўсе тушы дзікоў, здабытыя паляўнічымі па разавых дазволах, — патлумачыла прычыну занепакоенасці прэс-сакратар Дзяржінспекцыі Вольга Грамовіч. — Паводле даных Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, летась у 49 раёнах краіны (супраць 40 у 2011 годзе) былі выяўлены 94 выпадкі трыхінелёзу дзікоў (у 2011 годзе — 72 выпадкі), што сведчыць пра пагаршэнне эпізаатычнай сітуацыі па трыхінелёзе сярод прамысловых і сельскагаспадарчых жывёл.

Дарэчы, прадастаўляць у дыягнастычныя ветэрынарныя лабараторыі дакументы адносна правоў уласнасці на тушу ці паляўнічыя ліцэнзіі на адстрэл жывёл не трэба.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ХТО З ІХ ВЫРАСЦЕ?

**У Століне заведзена крымінальная справа ў дачыненні да 14-гадовай дзяўчынкі, якая ледзь не зарэзала 15-гадовага хлопца. Падлетак трапіў у бальніцу з цяжкім раненнем грудной клеткі, нож прайшоў у лічаных сантыметрах ад сэрца і пашкодзіў лёгкае.**

Юная фурыя закаціла сцэну рэўнасці і ўдарыла нажом сябра. Па прычыне ўзросту яе пакуль не затрымлівалі, хоць для гэтага ёсць падставы.

**Яна СВЕТАВА.**

## ПАЖАР НА РЫНКУ Ў БРЭСЦЕ

**Увечары 18 лютага ўспыхнуў пажар на трыкатажным рынку, размешчаным праз дарогу ад рынку «Стары горад» у мікрараёне Кавалёва. Гэта дробнаалтовы рынак па продажы прадукцыі брэсцкіх швейных прадпрыемстваў. У гэты дзень рынак не працаваў, там вяліся рамонтныя работы, якія, не выключана, маглі справакаваць узгаранне.**

Загарэлася ў самым цэнтры гандлёвых радоў. Выратавальнікі, якія прыбылі па выкліку, хутка лакалізавалі пажар, а праз 12 хвілін яго ліквідавалі. Выгарала 12 гандлёвых павільёнаў з унутранай аддзелкай і таварам. Людзі не пацярпелі ад агню, але медыкам давялося аказваць дапамогу некаторым жанчынам. Яны адчулі сябе дрэнна, калі ўсвядомілі, што страцілі значную частку тавару.

Паводле інфармацыі Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС, зараз працуе камісія, якая павінна ўстанавіць прычыны пажару.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## НЕ ПІ НА ВАДАЁМЕ!

**У 2012 годзе патанулі 47 дарослых мінчан, 15 з іх былі нецвярозымі (31% выпадкаў). Пра гэта паведаміў старшыня Мінскай гарадской арганізацыі АСВОД Фёдар Клюкач.**

У 2011 годзе патанулі 65 паўналетніх грамадзян, 32 з іх — у нецвярозым стане. Ф. Клюкач адзначыў, што ў зімовы час празмернае ўжыванне алкаголю падчас зімовай рыбалкі таксама можа закончыцца трагедыяй. Напрыклад, на мінулым тыдні супрацоўнікі АСВОД выратавалі зваршчыка аднаго са сталічных прадпрыемстваў. Нецвярозы мужчына атрымаў пераахаладжэнне пасля таго, як задрамаў каля лункі.

***«Мінск—Навіны».***


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома**

**ОРГАНИЗАТОР: КРУГЛИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**

| № лота | Местоположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер | Целевое назначение | Условия и ограничения | Расходы по подготовке и изготовлению документации, руб. | Начальная цена, руб. | Сумма залога, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Пуськи, ул. Кленовая, д. 27А, площадь – 0,2500 га кадастровый номер 225182310101000031 | Для строительства и обслуживания жилого дома | Водоохранная зона озера Черное | 3497908 | 3667750 | 366780 |

1. Аукцион состоится 22 марта 2013 года в 15.00 по адресу: д. Круглица, д. 15, сельисполком.

2. Заявления от граждан Республики Беларусь на участие в торгах принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Витебская область, Чашникский район, деревня Круглица, д. 15, сельисполком. **Последний день приема заявлений – 17 марта 2013 года до 17.00.**

3. Для участия в аукционе необходимо представить копию паспорта гражданина (без нотариального засвидетельствования); представителю гражданина – нотариально удостоверенную доверенность, а также копию паспорта доверенного лица; копию платежного документа, подтверждающего уплату налога на расчетный счет 3641326042200 ЦБУ № 222 филиала № 215 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Орша, код 647, УНП 300986823, код платежа 04901, получатель Круглицкий сельский исполнительный комитет.

4. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников.

5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами и земельным участком в натуре.

**КОНТАКТНЫЕ ТЕЛЕФОНЫ: 802133 2 58 35, 8 02133 2 58 45.**



Уважаемые акционеры ОАО «Дорожно-строительный трест № 4 г. Брест»!

Объявление о проведении очередного собрания акционеров ОАО «Дорожно-строительный трест № 4 г. Брест», опубликованное в газете «Звязда» от 15.02.2013 № 30 (27395), дополнить пунктом 7 «О внесении изменений в устав Общества».

Наблюдательный совет.

*УНП 200274482*



05 марта 2013 г. в 10.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестский КСМ».

Повестка дня:

1. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Брестский КСМ»: г. Брест, ул. Гоздецкого, 28.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Гоздецкого, 28.

Время регистрации в день проведения собрания с 10.00 до 10.30.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 27.02.2013 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Совет директоров.

УНП 200295903


«ГАРАЧЫ» 287 17 41

## АЎТАКРАМА БУДЗЕ Ў ВЁСЦЫ ПА ГРАФІКУ

**З вёскі Рэм Барысаўскага раёна патэлефанавала Надзея Ігнатаўна Налівайка: другі тыдзень запар да іх не прыязджае аўтакрама. На момант звароту, як удакладніла заяўніца, яе не было ўжо чатыры разы. Прычына, як патлумачылі жанчыне ў сельвыканкаме і ў раёне, у дарозе: падводзяць з расчысткай дарожнікі. Надзею Ігнатаўну і іншых жыхароў вёскі турбавала: калі ж аўтакрама, нарэшце, з'явіцца ў іх? Згодна з графікам наступны дзень заезду — пятніца, каля 18 гадзін... Вось і прасіла жанчына дапамогі, адначасова дзякуючы «Звяздзе» за мінулы раз.**

Справа ў тым, што некалькі месяцаў таму жыхары вёскі ўжо звярталіся ў нашу газету з нараканнямі на працу аўтакрамы. Тады асноўны кіроўца захварэў, а яго зменшчык не зусім належным чынам паставіўся да сваіх абавязкаў. ...Аператыўна звязацца з кіраўніцтвам Барысаўскага раённага спажывецкага таварыства, каб высветліць сітуацыю з заездам у Рэм аўтакрамы, у нас не атрымалася: таго не было на месцы па аб'ектыўных прычынах. Але пакінуць сам-насам вяскоўцаў з іх праблемай мы не маглі, таму былі вымушаны звярнуцца па дапамогу да **прэс-сакратара Белкаапсаюза Вольгі ХІЖАНКОВАЙ**.

— Пытанне вырашана: сёння аўтакрама будзе ў вёсцы абавязкова, — паведаміла Вольга. — Учора на месца выязджала кіраўніцтва раённага спажывецкага таварыства разам з прадстаўніком сельвыканкама. Дарога сапраўды была непрыдатная для праезду, пра што, дарэчы, раней паведамлялася дарожнікам. Але рычагоў уздзеяння тады з боку мясцовай улады, спажывецкага таварыства не знаходзілася. Зараз жа яны былі знойдзены: дарогу расчысцяць.

## «ПЕРАДАЧА НЕ З'ЯЎЛЯЕЦЦА РЭКЛАМАЙ»

**Мінчанка, якая патэлефанавала ў рэдакцыю па «гарачай лініі», нагадала, што рэклама варажбітак і экстрасэнсаў у Беларусі забаронена. Разам з тым па расійскім тэлеканале «РазТБ», які ідзе ў прамым эфіры, некалькі разоў на дзень выступаюць гэтыя самыя варажбіткі і экстрасэнсы. Даюць розныя парады, разглядаюць тыя ці іншыя сітуацыі. Тут жа на тэлеэкране можна пабачыць і нумары тэлефонаў, па якіх любы ахвотны можа звязацца з імі.**

«Канал свабодна дэманструюць у нашай краіне. Значыць, любы беларус можа скарыстацца прапанаванымі тэлефонамі. Як жа тады з забаронай рэкламы варажбітак і экстрасэнсаў?» — гаварыла заяўніца.

Пытанні чытачкі мы пераадрасавалі ў **Міністэрства гандлю**, адно з упраўленняў якога займаецца абаронай правоў спажыўцоў і кантролем за рэкламай. Вось што нам паведамілі ў межах кампетэнцыі на наш запыт.

«Трансляцыя тэлепраграм канала «РазТБ» ажыццяўляецца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з дазволу №0015 ад 19.04.2012 г., выдадзенага Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Перадача «Перагуляй лёс», у якой выступаюць варажбіткі і экстрасэнсы, уваходзіць у пералік тэлепраграмы тэлеканала «РазТБ», узгодненай для рэтрансляцыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Акрамя таго, перадача, якая ўваходзіць у склад праграмы канала, не з'яўляецца рэкламай. У гэтай сувязі нормы заканадаўства аб рэкламе не выкарыстоўваюцца».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



Блізкая ўлада

# «БУДУЧЫНЯ — ЗА БУДАЎНІЦТВАМ АРЭНДНАГА ЖЫЛЛЯ»

**Маладзечанскі раён — адзін з самых буйных і перспектыўных рэгіёнаў Мінскай вобласці, дзе стабільна развіваюцца прамысловасць і сельская гаспадарка. Разгалінаваная сетка аўтамабільных дарог і чыгункі, размяшчэнне на скрыжаваннях важных гандлёвых шляхоў: Мінск — Вільнюс, Полацк — Гродна, разнастайныя прыродныя рэсурсы — усё гэта робіць унікальны куток Міншчыны вельмі прывабным як для інвестараў, так і для турыстаў. Пра турыстычны патэнцыял рэгіёна, перспектыўныя інвестыцыйныя праекты, арэндны дом і чэмпіянат Еўропы 2013 года па пляжным валейболе размаўляем са старшынёй Маладзечанскага райвыканкама Фёдарам ДАМАЦЕНКАМ.**



**— Фёдар Аляксандравіч, назавіце самы перспектыўны на сёння для Маладзечанскага раёна інвестпраект?**

— Новы праект, звязаны з машынабудаваннем, вельмі перспектыўны не толькі для нашага рэгіёна, але і для дзяржавы ў цэлым. Плануем выпускаць на ЗАТ «Амкадор-Унікаб» вілачныя пагрузчыкі і электрацялежкі. Новая вытворчасць, якая размесціцца ў Маладзечне, дазволіць не толькі вырабляць імпартазамяшчальную прадукцыю, якая ў перспектыве будзе прыносіць валютную выручку, але і стварыць новыя высокапрадукцыйныя працоўныя месцы. Для таго, каб наша прадукцыя карысталася попытам за мяжой, трэба, вядома ж, каб вытворчыя плошчы адпавядалі еўрапейскім нормам. Якраз цяпер над гэтым і працуем. Акрамя таго, летась «Амкадор-Унікаб» набыў на аўкцыёне больш за 65 тысяч кв.м вытворчых плошчаў аднаго з маладзечанскіх прадпрыемстваў. Там плануецца вырабляць новыя віды дарожна-будаўнічай тэхнікі, у прыватнасці, аўтагрэйдары, асфальтаўкладчыкі. Сёння ідзе зборка доследнага ўзору, які, перш чым трапіць у масавую вытворчасць, павінен будзе прайсці прамысловыя выпрабаванні.

**— Наколькі я ведаю, у Маладзечне стартаваў пілотны праект па будаўніцтве арэнднага дома. Калі плануеце засяліць туды першых жыхароў?**

— Пытанне аб неабходнасці будаўніцтва такога дома мы падымалі яшчэ 3 гады таму, і, як бачыце, нашу ідэю падтрымалі. Сёння будаўніцтва ў самым разгары. Калі не будзе затрымак з фінансаваннем гэтага праекта, думаю, здадзім яго ўжо сёлета. Дом разлічаны на 60 кватэр, большасць з якіх 2-пакаёвыя.

**— Калі арэндны дом добра сябе зарэкамендуе, будзеце будаваць яшчэ?**

— У тым, што арэндны дом будзе карыстацца попытам, я нават і не сумняваюся. На мой погляд, за будаўніцтвам такога жылля будучыня. Ва ўсім свеце людзі сёння карыстаюцца арэндным жыллём. І мы, хоць і павольнымі тэмпамі, але ідзём у гэтым кірунку. Ужо сёння ёсць прапановы аб будаўніцтве долевага арэнднага дома для 4-5 прыватных буйных прадпрыемстваў. Але я лічу, што з гэтым пакуль не варта спяшацца, трэба паглядзець, наколькі будзе рэнтабельным для дзяржавы пілотны арэндны дом. Хачу сказаць, што мы актыўна займаемся будаўніцтвам не толькі ў горадзе, але і ў вёсках. Так, летась правялі мадэрнізацыю 15 малочна-таварных фермаў. У планах правесці рэканструкцыю яшчэ 4, а таксама пабудаваць 2 новыя фермы на 1000 месцаў кожная, з рознымі сістэмамі даення. Будзем выдзяляць дадатковае бюджэтнае фінансаванне для прывядзення ў парадак дарог, па якіх праходзяць транзітныя маршруты ў кірунку Гродна, Вільнюса, Смаргоні, Вілейкі і Нарачы. Акрамя таго, ужо практычна ўсе школы абсталявалі шлагбаумамі або агароджамі, каб папярэдзіць у будучыні трагедыю, якая не так даўно адбылася ў Мінску.

**— З якімі пытаннямі ў апошні час прыходзяць людзі да вас на прыём?**

— Асноўная маса пытанняў звязана з работай ЖКГ. Праўда, не ўсе скаргі аб'ектыўныя. Тым не менш, усе заявы разглядаем, стараемся, каб чалавек застаўся задаволены, нават калі пытанне вырашана не на яго карысць. Ёсць скаргі, якія патрабуюць нашага аператыўнага ўмяшання. Так, нядаўна да нас звярнулася інвалід, якая аказалася закладніцай сітуацыі па чарзе на кватэру. Яе паставілі ў чаргу, а праз нейкі час па нейкіх прычынах (як высветлілася, зрабілі дадатковае апытанне тых, хто стаяў у чарзе перад ёй, і адзін мужчына перадумаў і ўсё ж такі вырашыў уступіць у кааператыў) выключылі з яе. І атрымліваецца, чалавек, які ўжо быў уключаны ў ЖБК, атрымаў крэдыт, заплаціў першы ўзнос, застаўся ні з чым. У падобных выпадках наш абавязак разабрацца ў сітуацыі і дапамагчы чалавеку аднавіць справядлівасць. Я праводжу прыёмы не толькі ў сваім кабінеце, ахвотна сустракаюся з калектывамі на прадпрыемствах, езджу па вёсках. Адсочваем, каб для людзей, якія жывуць у аддаленых вёсках, былі даступны першачарговыя тавары, калі трэба, падключаем прыватнікаў. Забяспечваем не толькі дастаўку тавараў, але і паслуг, калі людзі ў іх маюць патрэбу. У адным з дамоў быту, у Гарадку, нават паставілі душавую кабінку.

**— Пасля Дажынак горад візуальна памяняўся. Як змянілася ў сувязі з гэтым жыццё рэгіёна?**

— Інфраструктура, якая была створана, адыгрывае істотную ролю ў развіцці горада і раёна ў цэлым. Жыццё жыхароў Маладзечна стала больш дынамічным, больш цікавым. Гэта звязана і з тым, што сюды сталі актыўна ехаць турысты. У нас шыкоўны Лядовы палац, які карыстаецца попытам не толькі ў нашых людзей, арандуюць яго для трэніровак і расійскія спартсмены. Чым больш людзей прыязджае ў горад, тым мы лепш жывём, у нас з'яўляюцца дадатковыя крыніцы даходаў па сектары грамадскага харчавання, наша новая гасцініца практычна ніколі не пустуе. Толькі летась тэмп росту паслуг па нашай сістэме грамадскага харчавання склаў 120% у супастаўных коштах. Гэта вельмі значны паказчык.

**— Фёдар Аляксандравіч, сёлета ў Маладзечне пройдзе чэмпіянат свету па пляжным валейболе. Як рыхтуецеся да гэтага маштабнага спартыўнага мерапрыемства?**

— Да 28 жніўня засталося не так шмат часу, таму рыхтуемся ва ўсю. Будуем стадыён на 1200 месцаў, з іх 600 стацыянарных, астатнія можна будзе перавозіць на іншыя мерапрыемствы. Гэта дазволіць нам і ў будучыні праводзіць на высокім узроўні падобныя спаборніцтвы.

**— Чула, што вы вялікую ўвагу надаяце здароваму ладу жыцця сярод работнікаў выканкама?**

— Плануем у канцы лютага правесці «лыжню», у якой будуць удзельнічаць работнікі выканкама, сельскіх і пасялковых Саветаў, упраўлення сельскай гаспадаркі. Штогод праводзім спартакіяду сярод работнікаў выканкама па 5 відах спорту. Кожны чацвер у нас праходзіць Дзень здароўя для дзяржслужачых. Пасля працы мы ўсе разам наведваем спартыўна-відовішчны цэнтр. Пасля агульнай для ўсіх размінкі расходзімся па розных залах займацца сваім любімым відам спорту. Сам вяду здаровы лад жыцця — і плаваю, і ў валейбол гуляю, і ў тэніс, няма відаў спорту, якімі я калі-небудзь не займаўся — і прывіваю гэту карысную звычку сваім калегам. Заўважыў, што заняткі ў спартзале выдатна ўплываюць на мікраклімат у калектыве і, безумоўна, спрыяюць у працы.

**Надзея ДРЫЛА,**
**фота аўтара.**





Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# «Няхай сонца свеціць вечна, ідзе горад Маладзечна!»

**Трэцяга ліпеня, у дзень вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Дзень незалежнасці краіны, маладзечанцы адзначаць чарговы Дзень горада. Свята абяцае быць асаблівым: сёлета Маладзечну спаўняецца 625 гадоў.**

Нагадаем, што традыцыя вядзе адлік з 2010 года. 27 кастрычніка на сесіі раённага Савета дэпутатаў па прапанове раённага выканаўчага камітэта прынята адпаведнае рашэнне. З таго часу Дзень горада стаў адным з самых масавых і любімых свят. За гэтыя гады ў яго правядзенне прыўнесена многа новага і цікавага. Шмат якія мерапрыемствы прыйшліся даспадобы гледачам і сталі традыцыйнымі. Напрыклад, тэатралізаванае дзейства на плошчы Старое Места каля скульптуры «Вяшчальнік», якая сімвалізуе першую згадку аб Маладзечне 16 снежня 1388 года, урачыстая цырымонія заключэння шлюбу маладымі, што праходзіць у гарадскім парку. Незабыўным і вельмі забаўным атрымаўся забег паўзункоў — шасцімесячных немаўлят.

— Мінулыя гады мы мелі на мэце расказаць пра ўзнікненне горада, правесці гледачоў праз тэатралізаванае прадстаўленне, — распавяла дырэктар дзіцячага цэнтра культуры «Росток» Алена Сакалоўская. — На гэты раз збіраемся крыху памяняць стэрэатыпы. А менавіта, задзейнічаць ў прадстаўленні ўсіх жыхароў горада: ад малога да старога. Хацелася б, каб яны не былі староннімі назіральнікамі, а прынялі актыўны ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах.

Арганізатары прыкладаюць максімальныя намаганні, каб ні ў чым не паўтарыцца, бо здзівіць жыхароў горада і рэгіёну вельмі цяжка. Маладзечна лічыцца культурным цэнтрам Мінскай вобласці. Горад вельмі творчы, штогод тут праходзіць звыш 30 культурных мерапрыемстваў міжнароднага, рэспубліканскага і абласнога ўзроўню, часта заглядваюць зоркі беларускай і замежнай эстрады. Напрыклад, традыцыйнымі сталі Рэспубліканскі фестываль беларускай песні і паэзіі, Рэспубліканскі тэатральны фестываль «Маладзечанская сакавіца», конкурсы высокай моды і шмат іншых.

— Нашы гледачы вельмі патрабавальныя, здзівіць іх нечым незвычайным вельмі цяжка, але мы пастараемся. Будзем імкнуцца ахапіць мерапрыемствамі літаральна ўсіх жыхароў. Будуць працаваць пляцоўкі для немаўлят, дзяцей, падлеткаў, сямейных пар, для людзей абсалютна розных густаў і інтарэсаў. Рабочая назва адной з пляцовак, напрыклад, «Сонца няхай ззяе вечна, ідзе горад Маладзечна», — раскрывае сакрэт Алена Расціславаўна. — Людзі заўсёды баяцца новага, лічаць, што лепш пастаяць, паназіраць збоку. Але ж, як паказалі мінулыя святы, няхай не адразу, але паступова яны ўспрымаюць новае. Напрыклад, гэта прадэманстраваў цюнінг дзіцячых калясак. Аказалася, што ў Маладзечне шмат крэатыўных маладых людзей, якія могуць даць фору прафесійным дызайнерам. Я мару каб свята стала адзіным карнавальным дзействам жыхароў Маладзечна. І спадзяюся, так яно і будзе.

На Дзень горада запланавана і яшчэ адна, як цяпер модна гаварыць, фішка, сюрпрыз, які рыхтуе дырэктар дзіцячай мастацкай школы Уладзімір Яцыновіч. Прафесійны саксафаніст, выкладчык па класе саксафона, упершыню ў Маладзечне мяркуе правесці фестываль саксафона.

— Да ўдзелу ў ім запрашаем школы нашага раёна, аматараў з іншых рэгіёнаў краіны, — канстатуе Уладзімір Паўлавіч. — У мяне, напрыклад, ёсць сябры — кіраўнікі саксафанічных ансамбляў, аркестраў, салісты, якія гатовы прыехаць у Маладзечна. Думаю, што ў нас павінна атрымацца сапраўднае свята.

Такога музычнага форуму ў горадзе яшчэ не было. На маю думку, ён знойдзе сваіх прыхільнікаў і стане традыцыйным.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Дырэктар Маладзечанскай дзіцячай школы мастацтваў Уладзімір ЯЦЫНОВІЧ таксама кіруе ансамблем «Біг-бэнд».**

# НЕАБЫЯКАВЫЯ І ТАЛЕНАВІТЫЯ

**Сёлета гімназіі-каледжу мастацтваў г. Маладзечна споўнілася 25 гадоў. Навучальная ўстанова з'яўляецца гонарам Міншчыны. Па-першае, у вобласці такіх больш няма. Па-другое, тут дзеці, акрамя вывучэння агульнаадукацыйных прадметаў, займаюцца рознымі відамі мастацтва: харэаграфічным, тэатральным, выяўленчым, музычным.**

— Пасля заканчэння дзявятага класа той, хто хоча звязаць сваё жыццё з творчасцю, можа паступіць у каледж і на працягу трох гадоў атрымаць спецыяльнасць настаўніка-мастака, артыста-выкладчыка, выкладчыка харэаграфічных дысцыплін, артыста драматычнага тэатра, — зазначае **дырэктар Вольга Хазікава.** — Акрамя таго, цяпер, у адпаведнасці з Кодэксам аб адукацыі, пачынаючы з пятага класа, вучні маюць магчымасць на павышаным узроўні вывучаць прадметы, змест якіх накіраваны на развіццё творчых здольнасцяў. Акрамя агульнаадукацыйных урокаў, яны шэсць гадзін на тыдзень займаюцца мастацтвам.

Педагогам ёсць кім ганарыцца. Іх выхаванцы — удзельнікі, дыпламанты і пераможцы рознага ўзроўню алімпіяд, творчых конкурсаў, фестываляў, навукова-практычных канферэнцый і выстаў. Далёка за межамі раёна ведаюць харэаграфічны ансамбль «Наш стыль».

— Калектыў створаны ў 1993 годзе. З таго часу ўжо адбылося пяць выпускаў, — дзеліцца выкладчыца, **кіраўнік ансамбля Галіна Курыловіч.** — Нашы артысты ўдзельнічалі ў фестывалі «Усе мы родам з дзяцінства», сталіся пераможцамі тэлевізійнага конкурсу «Тэлебом», «Зорны капеж», дыпламантамі конкурсаў «Калядныя сустрэчы», «Суквецце талентаў».

На конкурсе «Зорны капеж» сярод мастацкіх работ лепшай прызнаны твор вучня сёмага класа Уладзіслава Рудкевіча.

— Мне падабаецца маляваць партрэты і пейзажы, бо менавіта яны больш мне ўдаюцца. Кім хачу быць? Пакуль не задумваўся. Але, мабыць, звяжу сваё жыццё з творчай прафесіяй, напрыклад, ландшафтнага дызайнера, — упэўнены хлопец...

— Я выкладаю ў класе, дзе вучыцца Улад, беларускую мову. І магу сказаць, што ён вельмі старанны і адказны, — уступае ў размову **намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Ніна Пальчэўская.** — Хлопчык выхоўваецца ў шматдзетнай сям'і, дзе таленавітыя дзеці. Старэйшы брат Уладзіслава сёлета заканчвае каледж па спецыяльнасці мастак. Нашаму выхаванцу ёсць з каго браць прыклад.

Зрэшты, як і ўсім навучэнцам каледжа. Побач з імі неабыякавыя, таленавітыя педагогі, настаўнікі, якія імкнуцца максімальна раскрыць талент кожнага выхаванца. І няхай сабе не ўсе з іх стануць зоркамі. Але можна з упэўненасцю сказаць, што яны вырастуць сумленнымі, шчырымі людзьмі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# АД ПЕСЕНЬ «ХАРАШУХІ» — ХОРАША НА ДУШЫ

**Народны ансамбль народнай песні «Харашуха» даўно стаў «візітоўкай» Маладзечанскага раёна. Яго канцэрты праходзяць пры поўным аншлагу. Кожнае новае выступленне знакамітага калектыву збірае не толькі жыхароў горада, але і прыхільнікаў творчасці з суседніх раёнаў.**

Песні «Харашухі» даспадобы людзям усіх узростаў і густаў — беларускія, рускія, украінскія народныя, казацкія. У рэпертуары ёсць таксама і песні сучасных аўтараў. Іх нельга назваць песнямі ў прывычным сэнсе слова. Кожны твор суправаджаецца харэаграфічнай кампазіцыяй і нагадвае, хутчэй за ўсё, спектакль — чароўнае і незабыўнае відовішча. За дваццаць гадоў свайго існавання калектыў даў 700 канцэртаў. Ансамбль добра ведаюць і за межамі нашай краіны. Маладзечанскія артысты выступалі ў Малдове, Германіі, Польшчы, Расіі, Румыніі, ва Украіне. Часта нават не разумеючы мовы, замежныя слухачы адчуваюць песні ў выкананні «Харашухі» душой. Пранікнёныя, меладычныя, часам сумныя, а часам вясёлыя, жартоўныя, яны прымушаюць людзей смуткаваць, плакаць, смяяцца.

Гісторыя ансамбля пачалася ў 1992 годзе, калі Галіна Скурат аб'яднала вакол сябе неабыякавых людзей, аматараў народнай песеннай творчасці. Гэта былі выкладчыкі Маладзечанскай дзіцячай школы мастацтваў розных аддзяленняў. Росквіт калектыву пачаўся з прыходам новага мастацкага кіраўніка Вольгі Бялько. Менавіта яна прыўнесла творчы агеньчык, іскрынку ў дзейнасць ансамбля. І як сцвярджаюць удзельнікі, ні на хвіліну не дае ім спакою: пастаянныя рэпетыцыі, пошук новых песень, падыходаў у творчасці.

— Сёння ў нашым ансамблі 15 чалавек — сапраўдных аднадумцаў. У яго складзе таксама інструментальная група з пяці музыкантаў. Многіх з удзельнікаў ансамбля можна назваць старажыламі, якія ў калектыве з самага дня яго стварэння. Гэта Галіна Скурат, Вольга Чычова, Георгій Бажко, Іван Кісель, Галіна Купрыеўская, Вольга Лявіцкая, Таццяна Гражэвіч, Людміла Раінчыкава, — распавяла Вольга Паўлаўна. — А ва ўсіх пачынаннях нас падтрымлівае дырэктар дзіцячай школы мастацтваў Уладзімір Яцыновіч.

«Харашуха» прымала ўдзел у тэлевізійным праекце АТН «Песні маёй краіны». За выступленнем спевакоў сачылі літаральна ўсе маладзечанцы, без перабольшвання. — Ад экранаў тэлевізара не адыходзілі ні на хвіліну як людзі сталага веку, так і малыя дзеці. Праўда, перамагчы не ўдалося: на такім прадстаўнічым песенным форуме вельмі жорсткая канкурэнцыя. Але маладзечанскія артысты выйшлі ў паўфінал. А гэта дарагога каштуе.

— Мы паказалі сябе з найлепшага боку. Вядома ж, хацелася большага, але мы задаволены, што ўдалося паўдзельнічаць у такім праекце. Нашы артысты атрымалі шмат уражанняў, выпадак параўнаць свой творчы патэнцыял з магчымасцямі калег з іншых рэгіёнаў, — кажа Вольга Бялько.

— Як узнікла назва ансамбля? — цікаўлюся ў мастацкага кіраўніка.

— Мы доўга шукалі назву, перабралі шмат, але нічога не закранула сэрца. І вось адна з нашых удзельніц, Ірына Панкавец, знайшла ў слоўніку ёмкае беларускае слова «харашуха». Гэта значыць, «прыгожая», «вабная». Яно і дало назву нашаму калектыву.

Варта дадаць, што не так даўно «Харашуха» адсвяткавала сваё дваццацігоддзе. За шматгадовую творчую дзейнасць калектыў адзначаны Ганаровай граматай Беларускага саюза музычных дзеячаў. Справаздачны канцэрт прайшоў на «біс». Гучалі творы, якія не першы год выконваюць артысты, былі і прэм'еры. Асабліва даспадобы прыйшлася песня «Харашуха», якую развучылі спецыяльна да свята.

Варта дадаць, што пра «Харашуху» створаны дакументальны фільм. Яго аўтары — Людміла Раінчыкава, Вольга Апанасевіч і Вольга Яцэвіч. Стужка распавядае пра гісторыю стварэння калектыву, пра кожнага яго ўдзельніка, якія працуюць на прэстыж не толькі Маладзечаншчыны, але і краіны ў цэлым.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# «У НАС У ГОРАДЗЕ ТОЛЬКІ ПРЫВАТНЫХ ЦЫРУЛЬНЯЎ БОЛЬШ ЗА СТО»

**Інтэнсіўна на Маладзечаншчыне развіваецца малы і сярэдні бізнэс. Удзельная вага падатковых паступленняў у бюджэт ад прадпрымальнікаў дасягнула летась 40%. Гэта адзін з самых высокіх паказчыкаў у вобласці. Больш за тое, Маладзечанскі раён прызнаны «Лепшым раёнам для бізнэсу Беларусі-2012».**


Фота Надзеі БУЖАН.

Найбольшая канцэнтрацыя малога і сярэдняга бізнэсу, **як паведаміла намеснік старшыні Маладзечанскага райвыканкама Наталля НІКІЦЕНКА,** у сферы паслуг, якая апошнім часам вельмі актыўна развіваецца. «У нас сёння толькі ў бытавой сферы паслуг задзейнічаны больш за 460 прадпрымальнікаў. Прычым недзе 90 з іх аказваюць гэтыя паслугі на вёсцы. Адны з першых у рэспубліцы мы аддалі ў арэнду прыватнікам вясковыя комплексныя прыёмныя пункты. Безумоўна, бытавы бізнэс на вёсцы цяжкі, але 4 з іх замацаваліся. Таксама ў бліжэйшы час плануем выставіць на продаж пакеты акцый 5-ці невялікіх дзяржаўных прадпрыемстваў раёна, тым самым даць магчымасць прыватнікам укладваць у іх мадэрнізацыю ўласныя сродкі і атрымліваць прыбытак.

У раёне маецца 586 крам і 155 аб'ектаў грамадскага харчавання. Практычна ўсе гэтыя гандлёвыя аб'екты — прыватнай формы ўласнасці. Толькі прыватных цырульняў на тэрыторыі горада больш за 60, станцый тэхнічнага абслугоўвання — больш за сто. За кліента ідзе барацьба. І гэта добра, бо не сакрэт, што канкурэнцыя станоўча адбіваецца на якасці паслуг. Вельмі развіты ў нашым рэгіёне экспарт транспартных паслуг, каля 30 прадпрымальнікаў маюць ліцэнзію на ажыццяўленне міжгародніх і міжнародных рэйсаў. На дасягнутым спыняцца не збіраемся, будзем працягваць дзяржаўна-прыватнае партнёрства».

На думку маёй суразмоўцы, з часам сфера паслуг цалкам пяройдзе ў рукі прыватнікаў. І для гэтага маюцца ўсе ўмовы.

«У раёне створаны і даволі шчыльна працуюць, у тым ліку і з будучымі прадпрымальнікамі, Рада прадпрымальніцтва, два бізнэс-цэнтры па падтрымцы прадпрымальніцтва, якія праводзяць кансультацыі, у тым ліку і па інтэрнэце, — працягвае Наталля Нікіценка. — Гэта вельмі зручна, бо чалавек можа атрымаць адказ на любое сваё пытанне, звязанае з арганізацыяй прыватнага бізнэсу, не выходзячы з дому. Вядома, любому прадпрыемству для развіцця патрэбны плошчы. Дапамагаем, чым можам, прапаноўваем задзейнічаць пустуючыя будынкі. Канфіскуем маёмасць, якая не выкарыстоўваецца, у іншых прадпрыемстваў (тым самым здымаем з іх лішнюю падатковую нагрузку) і прадаём тым, хто адчувае ў ёй патрэбу. Для размяшчэння новых вытворчасцяў падбіраем зямельныя ўчасткі. Бізнэсменаў, на мой погляд, трэба рыхтаваць са школы. У сувязі з гэтым ствараем на базе ўстаноў адукацыі бізнэс-кампаніі. Ужо ёсць некалькі цікавых прапаноў. У прыватнасці, адна школа плануе закупіць батуты, гульнявыя пляцоўкі і аказваць платныя паслугі бацькам, якім на гадзінку-дзве трэба некуды ад'ехаць, але няма каму прыглядзець за дзіцем».

**Надзея ДРЫЛА.**

# ПРОВАДЫ Ў ДАРОСЛАЕ ЖЫЦЦЁ

**Не першы год у Маладзечне ў чэрвені, пасля заканчэння школьных іспытаў, ладзіцца раённы выпускны баль. Спачатку мерапрыемства праходзіла на Цэнтральнай плошчы горада, цяпер — у летнім амфітэатры, які з'явіўся ў гарадскім парку да рэспубліканскага свята «Дажынкі» ў 2011 годзе.**

Гэта вельмі маляўнічае і незабыўнае відовішча. Юнакі і дзяўчаты з усіх школ раёна разам са сваімі бацькамі і настаўнікамі ўрачыста праходзяць па вуліцах горада. А праводзяць іх у дарослае жыццё амаль ці не ўсе маладзечанцы. Запамінальны і хвалюючы момант — узнагароджанне медалістаў. Старшыня райвыканкама ўручае ім залатыя медалі, а аддзел адукацыі — атэстаты асаблівага ўзору і падарункі. Іх бацькі, у сваю чаргу, атрымліваюць Лісты падзякі старшыні райвыканкама. Лісты падзякі ўручаюцца і кіраўнікам устаноў адукацыі, дзе вучылася таленавітая моладзь.

Юныя грамадзяне ўскладаюць кветкі да стэлы ў парку Перамогі. Ну і, бясспрэчна, свята не абыходзіцца без «зорак» беларускай эстрады, якія віншуюць выпускнікоў, дораць ім любімыя песні. Заканчваецца баль, па традыцыі, маляўнічым феерверкам.

Як адзначыла начальнік аддзела адукацыі Маладзечанскага райвыканкама Іна Драпеза, выпускныя балі — працяг выхаваўчай работы з моладдзю, іх задача ў тым, каб яна вярталася на сваю малую радзіму пасля атрымання сярэдне-спецыяльнай, вышэйшай адукацыі. Падтрымка цяперашніх выпускнікоў пачынаецца са школы, з малодшых класаў. Формы яе розныя: ушанаванне пераможцаў алімпіяд, раённыя конкурсы, дзе дзеці могуць паўдзельнічаць і праявіць сябе, рэалізацыя інавацыйных, эксперыментальных праектаў. Выпускныя балі — адно са звёнаў гэтага карпатлівага выхаваўчага працэсу.


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# ПЕРШЫЯ КРОКІ «ПЕРСПЕКТЫВЫ»

## У Маладзечне створана гімназічная бізнэс-кампанія

**Бізнэс-кампанія «Перспектыва» ў гімназіі № 10 г. Маладзечна створана 1 студзеня 2013 года. Сёння тут дзевяць вучняў 9-10 класаў.**

— Пачыналі мы з пяці чалавек. Набіралі ўдзельнікаў па жаданні, але перавагу аддавалі дзецям, якія валодаюць камп'ютарам, адпаведнымі праграмамі, аргтэхнікай. Абсталяванне для офіса закупілі на пазабюджэтныя сродкі гімназіі, — адзначыла намеснік дырэктара ўстановы па вучэбнай частцы, кіраўнік кампаніі Таццяна Бурсава.

Варта сказаць, што юныя бізнэсмены прадастаўляюць шырокі спектр паслуг: каляровы і чорна-белы друк, друк фотаздымкаў, апрацоўка ў «Фоташопе», брашураванне, ламініраванне, сканаванне і набор тэксту ды іншае. Спачатку навучэнцы былі не зусім упэўненымі: ці будуць запатрабаваны іх паслугі? Новае і нязведанае заўсёды палохае. Але сумненні развеяліся, калі з'явіліся першыя наведнікі. І з кожным днём іх станавілася ўсё больш. Гэта педагогі і вучні школ горада, жыхары бліжэйшых мікрараёнаў. Ужо ёсць і пастаянныя кліенты. А даведаліся яны аб кампаніі з рэкламных акцый — дзеці распаўсюджвалі лістоўкі сярод мясцовых жыхароў. Сваю ролю адыгралі і аб'явы ў раённым друку, шмат дапамаглі і работнікі раённага аддзела адукацыі.

Натхнёныя першымі поспехамі, юныя прадпрымальнікі пачынаюць наступны праект па выпуску паштовак у стылі хэндмэйд. Гэта вельмі тонкая і карпатлівая ручная работа з дапамогай шаўковых стужак. Акрамя таго, яны плануюць друкаваць запрашэнні на разнастайныя ўрачыстасці, дыпломы для выпускнікоў дашкольных устаноў і памятныя дыпломы для вучняў 4 класаў.

— Таццяна Геннадзьеўна, якая мэта кампаніі: навучыць дзяцей весці бізнэс, зарабляць грошы? — Цікаўлюся ў кіраўніка.

— Мы не ставім на першае месца матэрыяльныя стымулы. Наша задача — навучыць выхаванцаў працаваць на аргтэхніцы, развіць камунікатыўныя навыкі, уменне працаваць у камандзе, з кліентамі, паказаць з найлепшага боку сваю прадукцыю, аказаць якасныя паслугі. Зарплата, безумоўна, у дзяцей ёсць, згодна з дагаворам яны атрымліваюць 10 працэнтаў ад паслуг. За студзень яны зарабілі пэўныя грошы. А ўжо за першы тыдзень лютага заробкі склалі столькі, як за мінулы месяц. Так што, нарошчваем аб'ёмы паслуг — і адпаведна павышаюцца заробкі нашых бізнэсоўцаў.

— Мне прапанавалі паспрабаваць свае сілы ў бізнэсе, і я не адмовіўся. Мне тут вельмі падабаецца, — з задавальненнем кажа Мікіта Малашка. — Не ведаю пакуль, якую спецыяльнасць выбраць, хацелася б паступіць у БНТУ. А веды, якія набуду ў кампаніі, мяркую, дапамогуць у будучай вучобе.

Для Ганны Мацкевіч першы рабочы дзень, як прызналася яна, быў цяжкаватым, стамілася. «Было шмат кліентаў, і кожнаму трэба было ўдзяліць увагу, час, якасна і ветліва абслужыць. Цяпер прывыкла, набралася вопыту», — прызналася Аня. Даша Арцюкевіч прыйшла ў кампанію па парадзе сяброў, але ў першы дзень захварэла. «З нецярплівасцю чакаю наступнага дня, каб паспрабаваць сябе ў бізнэсе», — сказала дзяўчынка.


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Дзевяцікласніцы Ганна ЗЕНЕВІЧ і Маргарыта РАК з паштоўкамі, зробленымі сваімі рукамі.**

## ■ Легенды мясцовага краю

### «Радуйся, красная маладзіца!»

Калісьці па Старавіленскім тракце ехала расійская імператрыца Кацярына. Выйшла яна з карэты, агледзелася: якая прыгажосць вакол! Ад захапіўшых яе пачуццяў царыца ўсклікнула: «Радуйся, красная маладзіца!» Па словах мясцовых жыхароў, ад гэтай фразы і пайшлі назвы населеных пунктаў Радашковічы, Краснае, Маладзечна. «Тым не менш гэта толькі прыгожая легенда, якая не знаходзіць дакументальнага пацвярджэння. На думку спецыялістаў, назва горада ўтварылася ад ракі Маладачанкі. На месцы яе ўпадзення ў раку Уша быў узведзены замак, з якога ў XIV стагоддзі і вырас горад. Прыкладаў таго, што ў Беларусі населеныя пункты называлі па аднайменных рэках, шмат: Віцебск — Віцьба, Полацк — Палата, Менск — Менка. Краснае, якое раней было Красным Сялом, азначае «прыгожае», а Радашковічы — «радасць».

### Напалеон першы. І апошні

Калі Напалеон Банапарт адступаў ад Масквы, то спыніўся ў маладзечанскім замку, каб даць бой рускім войскам. Але затым перадумаў, зняў з сябе паўнамоцтвы галоўнакамандуючага і, пераапрануўшыся ў форму польскага афіцэра, збег. Ад'ютант Банапарта на камiннай дошцы ў замку напісаў вугельчыкам: «Напалеон І». Калі мястэчка занялі рускія, ад'ютант Кутузава побач зрабіў прыпіску: «...і апошні». Цяжка сказаць, адкуль пайшла такая легенда, паколькі Кутузаў наогул ніколі не быў у гэтых краях, але і яна заслугоўвае ўвагі.

*Сабор Успення Прасвятой Багародзіцы.*


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЭНЕРГО-ЭКОЛОГОСБЕРЕГАЮЩАЯ СВЕТОТЕХНИКА
ЭНЭФ
Тел./факс (+375 176) 75-04-58, 76-39-11, 76-03-34
http://www.enef.by; e-mail: enef@enef.by

# Святло без праблем для кашалька і экалогіі

**Маладзечанскі завод «ЭНЭФ» ужо 22 гады распрацоўвае і вырабляе экалагічныя і энергазберагальныя свяцільні, у тым ліку са святлодыёдамі. Гэтыя вырабы ўкараняюць не толькі ў прадукцыю айчынных прадпрыемстваў — такіх, як «МАЗ», «Атлант», «Белкамунмаш». «Разумная» электроніка з Маладзечна паспяхова працуе і далёка за межамі Беларусі. Сакрэт поспеху прадпрыемства мы даведаліся падчас размовы з яго дырэктарам — Наталляй ГАЛОТАЙ.**


**На гэтым участку вырабляюцца платы для ачысткі вады. Таксама сярод прадукцыі ЭНЭФ можна ўбачыць і спецыяльныя індыкатары для халадзільнікаў, якія апавяшчаюць сваіх уладальнікаў пра адчыненыя дзверы.**



## «ЭЛЕКТРОНІКА — НАШ КАНЁК»

**— Наталля Іванаўна, наколькі я ведаю, вы працуеце на заво-дзе з першых дзён яго заснавання. Раскажыце, з чаго ўсё пачыналася?**

— Так, у маёй працоўнай кніжцы толькі два запісы: завод «Электрамодуль» і завод «ЭНЭФ». Перш чым узначаліць «ЭНЭФ» у 2005 годзе, я папрацавала там галоўным бухгалтарам, намеснікам дырэктара па эканоміцы, намеснікам дырэктара па камерцыйных пытаннях. Гісторыя ж завода пачынаецца з 1991 года. «ЭНЭФ» — тады яшчэ дзяржаўнае прадпрыемства (заснавальнікам якога быў «Электрамодуль») спецыялізаваўся на паўправадніковых блоках для зварачных агрэгатаў. У 1993 годзе, калі завод цалкам выкупіў свае акцыі ў дзяржавы, на нас (у той час на прадпрыемстве працавала толькі 25 чалавек) звярнула ўвагу вядомая фірма «Матарола», якая стала нам пастаўляць камплектуючыя для вырабу паўправадніковых блокаў без папярэдняй аплаты.

**— Сёння ж ваш канёк — гэта электроніка. У сувязі з чым узнікла ідэя асвоіць гэты перспектыўны кірунак дзейнасці?**

— Гэтай тэмай мы сталі займацца ўшчыльную з 1996 года дзякуючы « МАЗу», які ў той час выкупіў у немцаў распрацоўку аўтобуса «Неаплан». Яны папрасілі нас зрабіць для гэтага аўтобуса свяцільню, альтэрнатыўную нямецкай. Мы паспяхова справіліся з задачай: і дагэтуль усе свяцільні ў салонах «Неапланаў» менавіта нашы. «ЭНЭФ» — адзін з першых, хто стаў прапаноўваць электроніку ўзамен электрамагнітных дроселяў. Як цяпер памятаю, у 1999 годзе замянялі старыя прыборы асвятлення на свяцільні з нашым электронным начыннем у мінскіх школах і садках. Мы ганарымся тым, што яны і дагэтуль працуюць. Пасля з'явіліся іншыя фірмы — нашы канкурэнты, якія нас, прынамсі, як і мы іх, стымулююць да развіцця. Не спыняемся на нейкім адным кірунку, асвойваем розныя сферы: гэта электроніка для свяцільняў, якія выкарыстоўваюцца для асвятлення салонаў электрычак, электрацягнікоў, аўтамабіляў, самалётаў, нават падводных лодак, цяплічны кірунак, вулічнае асвятленне і г.д. Мы пастаянна абнаўляем асартымент сваёй прадукцыі на 20-25%: гэта могуць быць як прынцыпова новыя вырабы, так і старыя, удасканаленыя па пажаданнях нашых партнёраў. У тым ліку і дзякуючы ім у нас вельмі шырокая наменклатура: сёння мы выпускаем каля 500 найменняў вырабаў.

**— Ведаю, што вы актыўна развіваеце і такі модны сёння святлодыёдны кірунак.**

— Сапраўды, цяпер, асабліва ў Беларусі і Расіі, на слыху святлодыёдная тэма. Святлодыёды — гэта не проста эканомія, гэта яшчэ і экалогія. Як вядома, любая люмінесцэнтная лямпа змяшчае ртуць, таму яе няправільная ўтылізацыя можа нанесці шкоду. Святлодыёды ў гэтым плане зусім бяспечныя. Што тычыцца новых распрацовак, то якраз цяпер мы разам з «МАЗам» і «Белкамунмашам» асвойваем новую серыю святлодыёдных свяцільняў для аўтамабільнай вытворчасці. Па святлодыёднай тэме розных кірункаў мы супрацоўнічаем і са шматлікімі расійскімі партнёрамі.

**НА ААТ «ЭНЭФ» распрацаваны і серыйна выпускаюцца:**

* Электронныя пускарэгулюючыя апараты (далей — ЭПРА) для люмінесцэнтных, металагалагенных, бактэрыцыдных і газаразрадных лямп
* Энергазберагальныя свяцільні з ЭПРА для адміністрацыйных будынкаў, бальніц, школ, кінатэатраў, садова-паркавага і вулічнага асвятлення, транспартных сродкаў
* Крыніцы сілкавання для святлодыёдаў і святлодыёдныя модулі
* Блокі для светлавой індыкацыі і гукавой сігналізацыі рэжымаў работы халадзільных прыбораў
* Паўправадніковыя выпрамляльныя прыборы і блокі для электразварачнага абсталявання і крыніц сілкавання


**У аддзеле галоўнага канструктара распрацоўваюць прадукцыю, якая выпускаецца ў ЭНЭФ. На фота вядучы інжынер-канструктар Ігар МАЛОДЧАНКА. У яго абавязкі таксама ўваходзіць і распрацоўка блокаў кіравання для халадзільнікаў.**

## «Працуем з перадавымі кампаніямі свету»

**— Наталля Іванаўна, нягледзячы на тое, што ў вас склаліся плённыя партнёрскія адносіны з айчыннымі гігантамі прамысловасці, усё ж такі ваш асноўны рынак збыту знаходзіцца за межамі нашай краіны?**

— Так, ад 70-78% прадукцыі мы пастаўляем за мяжу. За больш як 20 гадоў, што я працую ў гэтай сферы, зразумела, што ніколі не трэба адмаўляцца ад маленькіх заказаў, бо маленькі заказ можа перарасці ў буйны. Так, сёння працуем з перадавымі кампаніямі свету. Маем партнёраў ва Украіне, у Расіі, Казахстане, Польшчы, Германія, Венгрыі, Славакіі, Галандыі. Прадукцыю «ЭНЭФ» дзякуючы нашым дастойным еўрапейскім партнёрам можна сустрэць нават у Кітаі, Аўстрыі, Амерыцы. І хоць мы выходзім на сусветны рынак у якасці камплектуючых вырабаў, тым не менш сваю валюту мы зарабляем самі. Я ганаруся, што з большасцю нашых партнёраў мы працуем і па 12, і па 14 гадоў. Гэта не толькі дазваляе нам стабільна працаваць, але і сведчыць аб надзейнасці і высокай якасці нашай прадукцыі. Апошняя вырабляецца з матэрыялаў і камплектуючых лепшых сусветных вытворцаў і адпавядае патрабаванням ISO 9001. Аднойчы без нашага ведама наш партнёр — амерыканска-венгерская кампанія «Лайтэк» (адзін з найбуйнейшых у свеце вытворца лямпаў для салярыя і медыцынскіх устаноў) — аддаў нашы апараты на тэсціраванне ў амерыканскую лабараторыю. І што вы думаеце? Іх там аднеслі да vip-класа.

**— На якіх значных аб'ектах за мяжой выкарыстоўваецца ваша прадукцыя?**

— Наша электроніка працуе на шматлікіх брэндавых аб'ектах. Толькі ў Маскве гэта і Вераб'ёвы горы, і 47 станцый метрапалітэна, і вось не так даўно Вялікі тэатр здалі пасля рэканструкцыі, там таксама 3000 нашых крыніц сілкавання пайшло на вонкавую і ўнутраную святлодыёдную падсветку. Паралельна развіваем такі неардынарны кірунак, як абеззаражванне паветра і вады. Вось, у прыватнасці, вы ў мяне ў кабінеце бачыце ўстаноўку для абеззаражвання паветра. Там уся электроніка наша стаіць. У гэтым кірунку працуем разам з замежнай кампаніяй «ЛІТ». Яна адна з першых распрацавала і пачала выпускаць ультрафіялетавыя лямпы. Нашы канструктары, у сваю чаргу, распрацавалі для гэтых лямп электроннае начынне. Пры гэтым пастаянна ўдасканальваемся, каб адпавядаць патрабаванням сваіх заказчыкаў: калі пачыналі з лямп магутнасцю 300 Вт, то цяпер выпускаем лямпы магутнасцю 800 Вт. Працуем з гэтай кампаніяй больш як 10 гадоў. Дзякуючы ім нашы вырабы ідуць па ўсім свеце, дзе вада ў басейнах ды вадазборніках абеззаражваецца выключна ультрафіялетавымі лямпамі.


**Андрэй КАМІНСКІ, намеснік начальніка цэха вытворчасці ЭПРА, назірае за ўстаноўкай бязвывадных элементаў вырабаў.**

## «У нас працуе каманда высакакласных спецыялістаў»

**— У скарбонцы завода «ЭНЭФ» мноства шматлікіх узнагарод за распрацоўкі, у тым ліку і міжнароднага ўзроўню. За кожнай з іх, вядома, праца ўсяго калектыву. Раскажыце пра вашых работнікаў?**

— Паверце, з такой камандай, якую я маю, можна смела рухацца наперад. Калі ў 2005 годзе нас было 90 чалавек, то цяпер — ажно 250. Гэта граматныя высакакласныя спецыялісты, многіх з іх мы вырасцілі самі. Мне, як дырэктару, вельмі радасна чуць, як мае канструктары размаўляюць на адной мове з нашымі партнёрамі. Калі я ў вас спытаю, што самае галоўнае ў бізнэсе, то які будзе адказ?

**— Вядома, атрыманне прыбытку.**

— Гэта, не буду пярэчыць, вельмі важна. Але для мяне, як для кіраўніка, заўсёды было (і застаецца) вельмі важным яшчэ і ажыццявіць творчыя ідэі сваіх канструктараў. Важна не толькі прафесійна гандляваць, але і ствараць нешта сваё. Гэта мы змаглі захаваць, чым вельмі ганарымся. Калі казаць пра клопат аб работніках, то вось ужо 20 гадоў, як мы выплачваем ім зарплату кожны тыдзень. Я лічу, гэта ў нас станоўчы момант, для мяне важна, каб у людзей заўсёды былі на руках грошы. Маладым спецыялістам з іншых рэгіёнаў матэрыяльна дапамагаем наймаць жыллё. Што тычыцца апошніх, то я рада, што большасць навучэнцаў профільных каледжаў практыку праходзіць у нас, бо мы маем магчымасць адбіраць для сябе будучых работнікаў. У нас на прадпрыемстве перадавыя тэхналогіі, свая інструментальная вытворчасць па вырабе абсталявання для тэсціравання, свая база канструктараў, свае распрацоўкі. Безумоўна, моладзі гэта цікава, і юнакі, і дзяўчаты з задавальненнем застаюцца ў нас працаваць. Мы ж, у сваю чаргу, не стаім на месцы, пастаянна закупляем сучаснае абсталяванне, пашыраем вытворчыя плошчы. І на дасягнутым, паверце, спыняцца не збіраемся.

**Надзея ДРЫЛА, Алена ДАЎЖАНОК, Надзея БУЖАН (фота).**

*УНП 600073968*


**На гэтым участку канчаткова збіраюцца ўсе вырабы. Адсюль яны выходзяць у гатовым да продажу выглядзе. На фота Алена ФІЛІСТОВІЧ, слесар-зборшчык.**

«МОЛОДЕЧНОМЕБЕЛЬ»

# КЛАСІЧНЫ ІНТЭР'ЕР ад ЗАТ «Маладзечнамэбля»

**Збіраецеся памяняць старую мэблю на новую альбо з густам абставіць перад наваселлем дом, катэдж ці кватэру? Тады запрашаем разам з намі наведаць адну з фірмовых крам ЗАТ «Маладзечнамэбля». Тут вам прапануюць мноства мадэляў корпуснай і мяккай мэблі для вашай спальні, сталовай, гасцінай, бібліятэкі, кухні, пярэдняга і дзіцячага пакояў. Якасныя ложкі і канапы, камоды і шафы, вітрыны і крэслы, выраблены з натуральнага масіву дубу, алешыны і буку, можаце не сумнявацца, напоўняць ваша жыллё элегантнасцю і камфортам.**


«Маладзечнамэбля» мае сеткі фірмовых крам па ўсёй Беларусі. Ветлівыя прадаўцы заўсёды гатовы дапамагчы выбраць патрэбны тавар.

## КОРПУСНАЯ МЭБЛЯ на любы густ

Шырокі асартымент прадукцыі, паводле слоў **намесніка генеральнага дырэктара па збыце прадукцыі, маркетынгу і рэкламе ЗАТ «Маладзечнамэбля» Сяргея МАРОЗА,** дазваляе задаволіць густ практычна кожнага пакупніка.

— Штогод у нас асартымент прадукцыі абнаўляецца на 30-40 працэнтаў, — кажа Сяргей Мароз. — Вырабляем мэблю сярэдняга і прэміум-класа пераважна класічнага стылю. Адсюль і адпаведны слоган: «Маладзечнамэбля» — у лепшых традыцыях класікі».

Праўда, пераканаліся на свае вочы, акрамя класічных рашэнняў, ёсць серыі і ў сучасным выкананні, якія будуць даспадобы людзям любога ўзросту. Так, у змешаным стылі выканана **набор мэблі для гасцінай «Паланэз».** У серыю «Паланэз» уваходзіць розная мэбля: шафы з вітрынай, тумбы пад тэлевізар, абедзенныя сталы, крэслы, што дазваляе абставіць гасціную і сталовую ў адным стылі. Мэбля «Паланэз» вызначаецца арыгінальным дызайнам, багаццем шкла і святла (у вітрынах ёсць штучная падсветка), што адпавядае апошнім павевам моды. Фасад выраблены з натуральнага масіву вольхі. Колер «чарэшні» выгадна падкрэслівае мяккасць і акамітнасць мэблі. Перавагай мэблі «Паланэз» з'яўляецца тое, што ёй можна абставіць нават невялікую па плошчы гасціную ў стандартнай кватэры.



Карыстаюцца попытам і вырабы, пафарбаваныя ў два колеры. У якасці прыкладу можна прывесці **мэблю для спальні калекцыі «Мішэль»,** якая спадабаецца ўладальнікам вытанчанага густу. Рамантычная мэбля «Мішэль», выкананая з масіву вольхі, будзе цудоўна глядзецца як у дзіцячым пакоі вашай дачкі, так і ў вашай утульнай спальні. Крэмавы і арэхавы колеры, а таксама раслінны арнамент надаюць гэтай мэблі лёгкасць і бязважкасць. Высоўныя скрыні ў шафах для адзення закрываюцца плаўна і бясшумна.

Пад гучнай назвай «**Оскар**» выпускаецца калекцыя мэблі для спальні і гасцінай прэміум-класа. Яна абавязкова спадабаецца вытанчаным асобам, бо аздоблена па-майстэрску выразанымі пры дапамозе лазера карункамі з дрэва. Прывабныя колеры, такія як «белая эмаль з пацінай», «арэх» і «венге з пацінай» ствараць утульную атмасферу. Гэтая мэбля праслужыць вам доўга, бо ўся элегантная фурнітура, якая адлівае серабром і золатам на масіве дубу, выключна еўрапейскай якасці.


«Оскар» абавязкова спадабаецца вытанчаным асобам, а прывабныя колеры створаць утульную атмасферу.

## МОДУЛЬНАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ, АБО САМ САБЕ ДЫЗАЙНЕР

Сёння «Маладзечнамэбля» — пазнавальны брэнд, які больш за паўстагоддзя паспяхова працуе на рынку і на справе даказаў сваю надзейнасць. У склад аб'яднання ўваходзяць тры фабрыкі: галаўное Маладзечанскае прадпрыемства па выпуску корпуснай мэблі, фабрыка мяккай мэблі ў Маладзечне і Вілейская мэблевая фабрыка. Каб быць бліжэй да пакупніка, актыўна развівае ўласную фірмовую гандлёвую сетку — сёння толькі ў нашай краіне маецца 16 гандлёвых дамоў з шыльдай «Маладзечнамэбля». Маецца ў прадпрыемства і свой уласны сайт **www.molodechnomebel.by**, які дае магчымасць, не выходзячы з дому, пазнаёміцца з багатым асартыментам прадукцыі. Акрамя таго, на сайце вы можаце адсочваць акцыі, зніжкі на пэўныя віды мэблі. Апошнія, паводле слоў **дырэктара маладзечанскага гандлёвага дома «Маладзечнамэбля» Аляксандра МАКСІМОВІЧА,** ладзяцца з зайздроснай перыядычнасцю.

Не можа не радаваць пакупнікоў і асартымент ЗАТ «Маладзечнамэбля». Тут выпускаюць **больш за 600 розных мадэляў і мадыфікацый прадукцыі.** Сказаць дакладную лічбу складана, бо на прадпрыемстве практыкуецца ў тым ліку і модульная вытворчасць.

— У кожнай фірмовай краме маюцца спецыяльныя модульныя праграмы, якія дазваляюць кліенту з дапамогай прадаўца-кансультанта сканструяваць з так званых «цаглінак» (стандартных модуляў) менавіта тую мэблю, якую ён хоча бачыць у сваім пакоі, — расказвае і паказвае Аляксандр Максімовіч. — Гэта паслуга карыстаецца папулярнасцю ў людзей, якія імкнуцца нават у інтэр'еры падкрэсліць сваю індывідуальнасць.

Пакуль што заказчыкам прапануюць ствараць дызайн-праекты з выкарыстаннем корпуснай мэблі. Але неўзабаве ў гандлёвы дамы паступяць і новыя модульныя праграмы, пры дапамозе якіх мяккую мэблю на камп'ютары можна будзе «апрануць» у любую тканіну ці скуру.

Варта адзначыць, што ў гандлёвых дамах «Маладзечнамэблі» вы можаце набыць як гатовыя наборы мэблі для любога пакоя, так і асобныя элементы.

— Пакупнік у сілу сваіх патрэб і матэрыяльных магчымасцяў набывае аптымальны варыянт для свайго жылля, — працягвае Аляксандр Максімовіч. — Гэта можа быць толькі камода ці вітрына і часопісны столік. Дарэчы, тут у нас выстаўлена ўсяго 27-30% таго, што выпрабляе «Маладзечнамэбля». Выставіць большы асартымент мэблі не дазваляюць плошчы крамы. Але гэта пакуль. Кіраўніцтва прадпрыемства і тут не стаіць на месцы, шукае шляхі расшырэння. Як чакаецца, ужо вясной скончыцца рамонт новага памяшкання, куды пераедзе мяккая мэбля. Тут жа будзе выстаўляцца выключна корпусная мэбля.

Пра якасць нашай мэблі сведчыць і вялікая колькасць пастаянных кліентаў. Сярод іх — шматдзетная сям'я з Мінска, у іх 12 дзяцей. Аднойчы, калі яны атрымалі доўгачаканую вялікую кватэру, прыехалі ў Маладзечна і на радасцях купілі ў нас самы дарагі ложак, які быў у краме. Праз нейкі час прыязджалі і дакуплялі камоды, тумбачкі, шафы. А летась прывезлі з сабой сына з нявесткай, каб маладыя выбралі ў нашым гандлёвым доме сабе падарунак на вяселле. Мы ж у сваю чаргу заўсёды стараемся ісці сваім пастаянным кліентам насустрач — робім зніжкі.


З такіх загатовачных матэрыялаў, дзякуючы ўмелым рукам Андрэя МАНДРЫКА, станочніка дрэваапрацоўчага станка, атрымліваюцца сталы «Паланэз».

**«АНТАЛІЯ»** — набор мяккай мэблі для гасцінай. Канапа і крэслы гэтай калекцыі разлічаны на вялікія дамы. Каркас выраблены з масіву буку, які фарбуецца ў розныя колеры, што дазваляе падабраць да гэтай мяккай мэблі і каркасную мэблю вытворчасці «Маладзечнамэблі». Канапа «Анталія» аздоблена маленькімі прывабнымі падушачкамі рознай формы. Пры іх вырабе прымяняецца якасная і прыемная на вобмацак тканіна.

**«ЛОНДАН»** — набор мяккай мэблі ў англійскім класічным стылі. Гэтыя вырабы з натуральнага дрэва і натуральнай скуры вылучаюцца сваёй элегантнасцю і высакародствам.


Канапа «Анталія» аздоблена маленькімі прывабнымі падушачкамі рознай формы.

## НАВІНКА — мэбля з арэху

На ЗАТ «Маладзечнамэбля» цяпер асвойваюць новы цікавы напрамак — мэблю з масіву арэху. Пробныя экзэмпляры набораў гэтай эксклюзіўнай мэблі для спальні і гасцінай можна было ўбачыць восенню на выставе ў Мінску.

— Мэбля з арэху атрымала шмат станоўчых водгукаў, таму мы цяпер займаемся дапрацоўкай і ўдасканальваннем гэтых набораў, — адзначыў Сяргей Мароз. — Ужо ў другім квартале гэтага года, думаю, людзі ўбачаць класічную калекцыю прэміум-класа «Луі» ў нашых фірмовых крамах. Мэбля, выробленая з масіву амерыканскага арэху, надасць вашаму памяшканню дух мінулых стагоддзяў, а ажурныя дэталі, класічныя формы і якасная фурнітура раскажуць пра добры густ гаспадара дома. Арэх — дрэва само па сабе дарагое. Драўніна арэху каштоўная тым, што мае свой непаўторны прыгожы малюнак, тым самым паказвае сваё «я». Фарбаваць і закрываць гэты малюнак, лічу, злачынства, таму драўніна арэху пакрываецца толькі лакам.


«Лондан» — набор мяккай мэблі ў англійскім класічным стылі, выраблены з натуральнага дрэва і натуральнай скуры.

## МЯККАЯ МЭБЛЯ для вашага дома

Больш як пяць гадоў таму прадпрыемства прыступіла да зусім новай для сябе вытворчасці — мяккай мэблі, якая адразу стала больш чым запатрабаванай у насельніцтва. За кароткі час скураныя канапы і крэслы з масіву дубу па праве заслужылі званне элітнай мэблі і сталі сапраўднай візіткай мэблевай фабрыкі.

— Наборы мяккай мэблі выпрабляюцца як у скураной, так і ў тканіннай абіўцы, — распавядае Сяргей Мароз. — Па колеры мэблевыя скуры падраздзяляюць на чорныя, каляровыя, шматколерныя, матавыя і бліскучыя з нанясеннем празрыстай лакавай эмульсіі. Для вырабу мэблі выкарыстоўваецца скура вытворчасці Італіі і Расіі. Многія канапы трансфармуюцца ў спальнае месца.

Паводле слоў генеральнага дырэктара ЗАТ «Маладзечнамэбля», вытворчасць мяккай мэблі — даволі перспектыўны накірунак.

— На нашай фабрыцы мяккай мэблі сёння працуе больш за 100 чалавек. Вырабатак на аднаго працаўніка там перавышае 90 тысяч долараў. Гэта пры тым, што цяпер на агульнадзяржаўным узроўні ставіцца задача выходзіць на ўзровень 60 тысяч долараў. Такіх паказчыкаў па прадукцыйнасці працы на чалавека плануем дасягнуць праз 3-4 гады ў цэлым па прадпрыемстве.

## «НАША МЭБЛЯ МАЕ СТАНОЎЧУЮ ЭНЕРГЕТЫКУ»

Фабрыка «Маладзечнамэбля» заваявала прызнанне не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Каб не быць галаслоўнымі, прывядзем толькі адну лічбу: на экспарт пастаўляецца ажно 65% прадукцыі прадпрыемства. І гэта, паводле слоў **генеральнага дырэктара ЗАТ «Маладзечнамэбля» Валерыя БУШЫЛЫ**, яшчэ не мяжа.

— І далей будзем працягваць павялічваць экспартныя пастаўкі, — распавядае Валерый Бушыла. — Ёсць пэўныя цяжкасці, тым не менш у параўнанні з мінулым годам мы выраслі па экспарце ажно на 15%, сёлета разлічваем на такі ж прырост.

Прадукцыя прадпрыемства пастаўляецца практычна ва ўсе краіны СНД, Германію, Літву, Францыю, Бельгію, Латвію, Эстонію...

— Сёння канкурэнцыя вялікая як на беларускім, так і на іншых рынках, куды мы пастаўляем сваю мэблю, — працягвае суразмоўца. — Вытрымліваць яе не так проста. Трэба прапаноўваць мэблю такога дызайну, каб у кожнага, хто ўбачыў яе, з'явілася жаданне набыць і парэкамендаваць сваім знаёмым. І, зразумела, якасць. Дызайн і якасць — гэта два пытанні, якімі мы займаемся шчыльна. Для гэтага праводзім мадэрнізацыю, укараняем новыя тэхналогіі, закупляем новае абсталяванне з лічбавым праграмным кіраваннем, якое робіць уплыў работніка на вытворчы працэс мінімальным.

**— Валерый Уладзіміравіч, а вам асабіста якая мэбля падабаецца?**

— Вядома ж, маладзечанская. Сур'ёзна, і не таму, што я ўзначальваю гэта прадпрыемства. Мне насамрэч падабаецца мэбля з масіву натуральнага дрэва, бо яна мае сваю станоўчую энергетыку.

**— А сам гендырэктар уносіць сваю лепту ў дызайн прадукцыі?**

— Я часта кажу на планёрках, што калі б я быў дызайнерам, то ў мяне б пераважаў бэжавы колер *(усміхаецца)*. Лічу, што кожны павінен займацца сваёй справай. У нас на прадпрыемстве працуюць цудоўныя спецыялісты (у асноўным маладыя людзі), яны вывучаюць рынак, густы людзей. Я, безумоўна, уваходжу ў камісію, якая ацэньвае новыя распрацоўкі, магу выказаць свой погляд, сказаць, што мне падабаецца, што не. Але самі разумееце, тое, што аднаму падабаецца, можа не спадабацца іншаму. Колькі чалавек, столькі думак, таму ўсе рашэнні прымаем калегіяльна. І ведаеце, нягледзячы на тое, што часам нялёгка ўгадаць, што будзе карыстацца попытам, угадваем. Пра гэта сведчыць высокая рэнтабельнасць прадпрыемства.



Станок «Ровер» з праграмным кіраваннем дапамагае выконваць больш за 1000 розных аперацый па фрэзераванні дэталяў мэблі. На фотаздымку станочнік Аляксей СТАНЕВІЧ.

## НЕ ТОЛЬКІ ЯКАСНАЯ, АЛЕ І ЭКАЛАГІЧНА ЧЫСТАЯ


Якасць апрацоўкі дэталяў правярае намеснік начальніка цэха брусковых дэталяў і фасадаў мэблі Аляксей ПІРАГОЎ. У руках — спінка ад крэсла «Архідэя».

Пытанне экалогіі з'яўляецца надзённым для Беларусі. Вось чаму мэблевая фабрыка пры вытворчасці мэблі для дома аддае перавагу натуральным, высакаякасным і экалагічна чыстым матэрыялам. Усе мадэлі выраблены з натуральнай драўніны. Клеі і саставы для апрацоўкі мэблі праходзяць абавязковы кантроль.

— Калі раней мы прымянялі нітралакі, то пачынаючы з мінулага года ўзмоцнена пераходзім на лакі і фарбавальнікі на воднай аснове, — распавядае гендырэктар прадпрыемства. — Гэта экалагічна чыстыя матэрыялы, без усемагчымых хімічных дабавак. Дарэчы, фабрыка мяккай мэблі ўжо сёння цалкам працуе на водных лаках. У сувязі з гэтым толькі за мінулы год шкодныя выкіды ў атмасферу зменшылі на 100 тон.


Мэбля «Паланэз» вылучаецца арыгінальным дызайнам, багаццем шкла і святла, што адпавядае апошнім павевам моды.

## ПРА МАДЭРНІЗАЦЫЮ

Ніякае тэхнічнае развіццё ў сучасным свеце немагчыма без перадавых тэхналогій. Таму, як і любое паспяховае прадпрыемства, «Маладзечнамэбля» выдаткоўвае на мадэрнізацыю штогод істотную частку прыбытку. Варта адзначыць, што за сваю гісторыю кіраўніцтва прадпрыемства ні разу не звярталася па крэдыт у банк, вядзе рэканструкцыю і мадэрнізацыю толькі за кошт уласных сродкаў.

— Так, на тэрыторыі Вілейскай мэблевай фабрыкі летась пачалося будаўніцтва новага цэха, які мы плануем увесці ў эксплуатацыю сёлета ў першым квартале. Гэта дазволіць там павялічыць аб'ёмы вытворчасці і стварыць новыя працоўныя высокапрадукцыйныя месцы. У планах таксама да 2015 года пабудаваць новы высокатэхналагічны цэх у Маладзечне. Гэта будзе цэх дэталяў з масіву, дзе будуць выпрабляцца фасады для нашай мэблі з драўніны дубу і вольхі. Штогод вялікія грошы ўкладаем у закупку сучаснага высокатэхналагічнага абсталявання, найноўшых тэхналогій. Менавіта таму знос асноўных фондаў у нас неістотны — складае крыху больш за 27%.

## ЗА КОЖНАЙ УЗНАГАРОДАЙ — ПРАЦА КАМАНДЫ ПРАФЕСІЯНАЛАЎ

Прадукцыя ЗАТ «Маладзечнамэбля» штогод адзначаецца шматлікімі ўзнагародамі розных рэспубліканскіх і міжнародных мэблевых выстаў за дызайн, высокую якасць, шырокі асартымент, высокі тэхнічны ўзровень вытворчасці. Стабільна высокая якасць тавараў пацверджана неабходнымі сертыфікатамі. Акрамя таго, варта адзначыць, што прадпрыемства два разы запар атрымлівала прэмію ўрада за дасягненні ў вобласці якасці.



Станочнік Дзяніс ДЗЕРЖАВЕЦ у машынна-паніравальным цэху выконвае аперацыю па раскройцы.

За кожнай узнагародай стаіць нястомная і самаадданая праца каманды сапраўдных прафесіяналаў, якія робяць усё магчымае, каб прапанаваць пакупніку мэблю найвышэйшай якасці. Кіраўніцтва прадпрыемства, у сваю чаргу, клапоціцца пра сваіх работнікаў, асабліва пра стан іх здароўя.

— У нас вялікі пакет сацыяльных праграм, якія ахопліваюць, у прынцыпе, усе бакі жыцця, — распавядае **намеснік гендырэктара па сацыяльных пытаннях Анатоль БЯЛЯЎСКІ.** — Што тычыцца клопату пра здароўе работнікаў, то на прадпрыемстве маецца свой фізіятэрапеўтычны і стаматалагічны кабінеты, забяспечаныя дарагім сучасным абсталяваннем, адна з лепшых у горадзе масажыстак. Імкнёмся папярэджваць усе хваробы, і кіраўніцтва не шкадуе на гэта грошай. Напрыклад, не так даўно запрасілі прафесара-мамолага, каб ён дапамог нашым работніцам вызначыцца са сваім станам здароўя. Дзейнічае на фабрыцы і група аздараўлення — штомесяц для работнікаў і членаў іх сем'яў закупляем 60 абанементаў у басейн. Стараемся зрабіць умовы працы і адпачынку работнікаў, якія ствараюць камфортную мэблю для кліентаў, таксама як мага больш камфортнымі.

УНП 600203065 **Надзея ДРЫЛА, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Надзеі БУЖАН.**

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Маладзечанскі завод металаканструкцый» — адзін з буйнейшых вытворцаў будаўнічых металічных канструкцый сярод краін СНД. Яго прадукцыя добра вядомая і карыстаецца папулярнасцю не толькі ў краінах былога СССР, але блізкага і далёкага замежжа. Адлік сваёй гісторыі завод вядзе з 1968 года.

Лёгкія металічныя канструкцыі маладзечанскай серыі пры Савецкім Саюзе былі запатрабаваны ледзь не ва ўсіх рэспубліках, у тым ліку Латвіі, Эстоніі, Літве, Украіне, Расійскай Федэрацыі. Якасная і надзейная прадукцыя карысталася попытам і ў краінах былога сацыялістычнага лагера: Венгрыі, Югаславіі, Румыніі. З развалам вялікай і магутнай краіны значна скарацілася, а затым і спынілася серыйнае і тыпавое будаўніцтва. Для прадпрыемства наступілі нялёгкія часы. Многія прадракалі, што гігант разваліцца. Нават нямецкія партнёры не верылі, што завод выкараскаецца, не абанкруціцца. Кіраўніцтва добра разумела, што трэба адыходзіць ад серыйнай вытворчасці і арыентавацца на індывідуальныя заказы — так патрабаваў рынак.



Сёння асноўная прадукцыя завода — металаканструкцыі сярэдняй і павышанай групы складанасці па індывідуальных праектах, сярод якіх няма ніводнага аднолькавага. «На рахунку» Маладзечанскага завода металаканструкцый шмат спартыўных, гандлёвых, культурных аб'ектаў. На здымку: ангар для самалётаў.

РУП «Маладзечанскі завод металаканструкцый»:

# Усё лепшае з мінулага ў будучыню

## У вялікага прадпрыемства вялікія перспектывы

— Мы пачалі вырабляць вежы для сотавай сувязі. У 1995 выпусцілі першую, якая і сёння стаіць у Кірышах. Усяго ж іх зрабілі каля 2 тысяч. Шмат заказаў выканалі для расійскага газавага і энергетычнага комплексу, газаправода Ямал — Еўропа. Напрыклад, гільзы для праколу аўтастрад, рэзервуары для захоўвання нафтапрадуктаў з падвойнымі сценкамі, астраўныя і прыбярэжныя радыёвежы (маякі) і шмат іншага. Сёння асноўная наша прадукцыя — металаканструкцыі сярэдняй і павышанай групы складанасці па індывідуальных праектах, сярод якіх няма ніводнага аднолькавага. Пры іх выкананні нашы канструктары строга прытрымліваюцца памераў дэталяў з дакладнасцю да міліметра. І мы сумленна і якасна адпрацоўваем любы заказ, — расказвае **дырэктар Маладзечанскага завода металаканструкцый Міхаіл АНГЕРЧЫК.**



Усе зваршчыкі на прадпрыемстве экіпіраваны спецыяльнай маскай з сістэмай ачысткі паветра і дыхальнай сумессю.

— У нашага завода толькі адзін вялікі недахоп — адсутнасць серыйнай вытворчасці — і адна перавага: нам не патрэбна серыйная прадукцыя. Мы можам зрабіць любыя канструкцыі, якія запатрабаваны літаральна на ўсіх складаных і значных аб'ектах.

Зазначу, што такіх налічваецца больш за сотню: спартыўныя, сацыяльныя, гандлёвыя, культурныя, аграрныя, медыцынскія. Усе яны маюць вялікае значэнне для жыцця краіны, яе грамадзян. І кожны з іх па праве можна назваць унікальным. Напрыклад, «Мінск-Арэна», футбольны манеж у сталіцы, спартыўна-забаўляльны цэнтр у Маладзечна, амфітэатр «Славянскі базар» у Віцебску. Шырокую вядомасць у краіне і за мяжой атрымала Нацыянальная бібліятэка Беларусі — інтэлектуальны цэнтр нацыі. У яе будаўніцтва шмат высілкаў і часцінку душы ўклалі працаўнікі завода. Закончылася пастаўка каля 7 тыс. тон канструкцый для спартыўнага комплексу ў Чыжоўцы, які павінен адкрыцца да чэмпіянату свету па хакеі 2014 года. Завадчане ў «спартыўнай тэме» даўно. Першы вопыт атрымалі пры будаўніцтве аб'ектаў да маскоўскай Алімпіяды, якая адбылася ў 1980-м.



Зусім нядаўна завод стаў вырабляць сучасныя металаканструкцыі з нержавеючай сталі. Каля першай партыі — майстар Валянцін БАЛЫШ і начальнік участка камплектацыі і экспедыцыі Дзмітрый КЛІМОВІЧ (злева направа).



Зборка калон для Беларускага металургічнага завода.

З іх удзелам узведзены лядовыя палацы ва ўсіх абласцях Беларусі. Зараз завяршаецца будаўніцтва крытага стадыёна ў Барысаве. Пастаўку прадукцыі для гэтай звышсучаснай футбольнай арэны таксама ажыццявіў Маладзечанскі завод металаканструкцый.

Варта дадаць, што часам даводзіцца вырабляць не проста асобныя аб'екты, а цэлыя наменклатурныя рады прадукцыі, як, напрыклад, металаканструкцыі каркасаў для лядовых палацаў. Аб'екты, дзе выкарыстана прадукцыя завода, можна ўбачыць не толькі ў Беларусі, але і на неабсяжных прасторах Расіі: ад Мінска да Масквы і Санкт-Пецярбурга. Напрыклад, пры ўзвядзенні Іжорскага трубнага завода ў Санкт-Пецярбургу, буйнейшых расійскіх гандлёвых цэнтраў выкарыстаны менавіта маладзечанскія канструкцыі. Вельмі тонкая і ювелірная работа была зроблена пры выкананні заказу па ўзвядзенні культурна-гандлёвага цэнтра ў Санкт-Пецярбургу «Балтыйская жамчужына», дзе маладзечанцы ўстанавілі 700 тон металаканструкцый. На іх рахунку і заказы для фірмовых прыбалтыйскіх і расійскіх аўтацэнтраў.

Важнейшым фактарам поспеху з'яўляецца ўзровень прафесіяналізму калектыву. На прадпрыемстве ёсць вучэбны пункт па падрыхтоўцы па рабочых спецыяльнасцях, навучанне вядзецца сваімі сіламі. Бясспрэчна, што выпуск такой унікальнай прадукцыі патрабуе навыкаў, майстэрства, якія трэба падтрымліваць і павышаць пастаянна. Возьмем, напрыклад, зборшчыкаў канструкцый, разметчыкаў, зваршчыкаў. Яны павінны валодаць не толькі працоўнымі навыкамі, але і мець мысленне інжынера, каб дакладна, без памылак працаваць. І такіх майстроў сваёй справы тут шмат. Варта дадаць, што сёння калектыў узначальваюць людзі, якія прайшлі ўсе прыступкі працоўнай лесвіцы менавіта на родным прадпрыемстве. З гэтай кагорты і кіраўнік завода Міхаіл Ангерчык. Міхаіл Аляксандравіч закончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, працаваў майстрам цэха, інжынерам-тэхнолагам, затым начальнікам тэхнічнага бюро, галоўным інжынерам, выканаўцам абавязкаў дырэктара, а з 2002 года прызначаны дырэктарам. Менавіта на гэтых пасадах ён шмат зрабіў, каб прадукцыя была канкурэнтаздольнай на постсавецкай прасторы. І сённяшняя вытворчасць, якая працуе зладжана і дакладна, — лепшая ўзнагарода за шматгадовую працу. Свой вопыт кіраўнік перанёс і на ўсе службы і падраздзяленні. Ад калектыву патрабуе перш за ўсё адказнасці за сваю працу, канчатковы вынік, выпуск якаснай і канкурэнтаздольнай прадукцыі.

У завода шырокія рынкі збыту — як у Беларусі, так і за яе межамі. І на прадпрыемстве актыўна шукаюць новыя. У прыватнасці, першыя адгрузкі пачаліся ў Туркменістан, дзе будуецца горнаўзбагачальны камбінат, у стадыі прапрацоўкі шэраг расійскіх заказаў. Прадукцыя экспартуецца ў Германію, Польшчу, Казахстан, Прыбалтыку. А нядаўна прадпрыемства пачало выпуск металаканструкцый з нержавейнай сталі, якія ўжо знайшлі сваіх спажыўцоў.

Прадпрыемства мае сваіх дылераў у Расіі і Прыбалтыцы, ёсць магчымасць цесна працаваць са спажыўцамі. Рынак Расіі самадастатковы. Пасля распаду Саюза прадпрыемствы, якія вызваліліся з іншых галін народнай гаспадаркі, перакваліфікаваліся на будаўніцтва. Па расійскім заканадаўстве на вытворчасць апорных каркасаў не патрэбна ліцэнзія. Часам яны прапаноўваюць сваю прадукцыю па больш нізкіх цэнах. Акрамя таго, вядучыя расійскія фірмы адкрылі свае прадстаўніцтвы ў Беларусі і прадаюць сваю прадукцыю за беларускія рублі.

Беларускаму гіганту складана ў тым плане, што пастаянна павышаецца кошт металапракату, які ідзе з Расіі. Разам з тым, як бы ні складвалася рынкавая сітуацыя, тут спадзяюцца толькі на асабістыя сілы, імкнуцца ісці ў нагу з часам, укараняць новыя сучасныя тэхналогіі. Сёння распрацавана праграма мадэрнізацыі, удасканалення вытворчасці. Яна прадугледжвае мноства фактараў. Напрыклад, аптымізацыю колькасці працуючых.

Па-другое, робяць стаўку на ўкараненне сродкаў механізацыі, аўтаматызацыі, энергазберагальнага абсталявання, эфектыўных матэрыялаў, якія дазволяць павысіць прадукцыйнасць працы. Пры гэтым разлічваюць перш за ўсё на асабістыя фінансы.

Здавалася б, экіпіроўка зваршчыка — дробязь, бо каштуе яна не вельмі шмат. Але на МЗМ пралічылі, што маска зваршчыка з сістэмай ачысткі паветра і дыхальнай сумессю павысіла прадукцыйнасць працы на 10 працэнтаў. Гэтая сістэма значна спрашчае работу, не адцягвае ўвагу на пабочныя рэчы, дазваляе кіраваць працэсам перамяшчэння дэталяў, не здымаючы маску.

Стварэнне годных умоў працы, побыту, адпачынку для кожнага работніка — на першым плане. На тэрыторыі завода працуе сталовая, абеды тут значна таннейшыя, чым у пунктах грамадскага харчавання горада. Акрамя таго, харчавацца тут можна ў лік заработнай платы. Грошы вылічваюцца праз месяц. Кажуць, гэта танна і вельмі выгадна. Непасрэдна ў цэхах створаны пакоі для прыняцця ежы. На балансе прадпрыемства і тры рабочыя інтэрнаты, дзе пражываюць як халасцякі, так і маладыя сем'і. А для тых, хто сябруе з фізкультурай і спортам, заўсёды адчынены дзверы фізкультурна-аздараўленчага комплексу.

*УНП 600136845*



Стварэнне дастойных умоў працы, быту, адпачынку для кожнага работніка — на першым плане. На тэрыторыі завода працуе сталовая. Абеды тут значна таннейшыя, чым у пунктах грамадскага харчавання горада.




## Мінскі мэблевы цэнтр:

# КРЭАТЫЎНАСЦЬ, ЯКАСЦЬ, ІНАВАЦЫІ

**Сумеснае прадпрыемства «Мінскі Мэблевы Цэнтр» — адно з найбольш паспяховых экспартаарыентаваных прадпрыемстваў Беларусі, што працуе з замежнымі фірмамі па індывідуальных заказах. Яго заснавальнікі — Маладзечанскі завод металаканструкцый, на тэрыторыі якога знаходзіцца Цэнтр, Мінскае вытворчае лесагаспадарчае аб'яднанне, прыватная нямецкая фірма HASSE GMBH.**



Мэбля для моладзевага пакоя



Гарнітур для дзіцячага пакоя.

Адлік сваёй гісторыі прадпрыемства вядзе з 1989 года. У другой палове 80-х гадоў мінулага стагоддзя ў нетрах Бюро па машынабудаванні Савета Міністраў СССР нарадзілася ідэя закупіць у Заходняй Германіі буйную партыю разнастайнага дрэваапрацоўчага абсталявання для стварэння некалькіх сумесных прадпрыемстваў па выпуску корпуснай мэблі з масіву драўніны. Адну з вытворчасцяў вырашана было размясціць у Беларусі. Гэта была добрая задума, паколькі ў той час татальнага дэфіцыту нельга было купіць нават просценькі мэблевы гарнітур. Арыгінальнасць ідэі заключалася ў тым, што мэблю планавалася выпускаць з масіву сасны, драўніны адносна таннай і распаўсюджанай на тэрыторыі былога Савецкага Саюза. Да гэтага часу ніхто такога не вырабляў.

Стварэнне прадпрыемства было абумоўлена яшчэ і тым, што ў канцы 80-х перад лясной гаспадаркай рэспублікі, у тым ліку і Мінскім вытворчым лесагаспадарчым аб'яднаннем, паўстала праблема рэзкага павелічэння выпуску тавараў народнага спажывання. Пастаўленая ўрадам задача выпуску таварнай прадукцыі ў адзін рубель на кожны рубель фонду аплаты працы выконвалася толькі на 20 працэнтаў. Павелічэнне аб'ёмаў перапрацоўкі драўніны стрымлівалася адсутнасцю фондаў на яе атрыманне, а таксама вытворчых магутнасцяў. Выхад з сітуацыі бачыўся адзін: асваенне тэхналогіі, якая б дазваляла атрымліваць з аднаго кубічнага метра піловачнай сыравіны найбольшы выхад таварнай прадукцыі. Такая тэхналогія прадугледжвалася пры стварэнні Цэнтра.

На шляху станаўлення давялося пераадолець шмат цяжкасцяў. Напрыклад, сутыкнуліся з адсутнасцю транспарту для падвозкі піламатэрыялаў, кантэйнераў для адвозкі пілавіння. Сур'ёзным тормазам стала недастатковая магутнасць сушыльнай гаспадаркі, няздольная забяспечыць бесперапынны працэс вытворчасці, адсутнічалі складскія памяшканні для захоўвання камплектуючых і гатовай прадукцыі, пад'ёмна-транспартнае абсталяванне.

На жаль, і абсталяванне лесапільных цэхаў лясгасаў не забяспечвала неабходнай якасці піламатэрыялаў. І тады Мінскае лесагаспадарчае аб'яднанне прыняло рашэнне аб продажы Ільянскай лесапільнай вытворчасці Вілейскага лясгаса Цэнтру. Там тэрмінова было заменена абсталяванне на больш эфектыўнае. У выніку Цэнтр атрымаў другую пасля Крупскай лесапільную вытворчасць.

**Тэрыторыю Крупскай лесапільні выклалі плітамі, устанавілі тры новыя сушыльныя камеры, лініі для перапрацоўкі дробнатаварнай драўніны. Два шведскія аўтамабілі «Сканія», якія набылі, вельмі хутка акупіліся, таму што расходуюць значна менш паліва, а прадукцыі бяруць у разы больш.**

Трэці год тут сур'ёзна займаемся мадэрнізацыяй лесапільняў. Тэрыторыю Крупскай выклалі плітамі, устанавілі тры новыя сушыльныя камеры, лініі для перапрацоўкі дробнатаварнай драўніны. Два шведскія аўтамабілі «Сканія», якія набылі, вельмі хутка акупіліся, таму што расходуюць значна менш паліва, а прадукцыі бяруць у разы больш. Праўда, за кожны рэйс даводзіцца плаціць па 30 еўра, паколькі на шашы ўстанавілі пункт па зборы дарожнага падатку. Была нават задума закрыць вытворчасць у Крупках. Але там працуе 100 чалавек — маладых мужчын, якім трэба забяспечваць сем'і, дзяцей. Таму пайшлі іншым шляхам. Летась стварылі там цэх па вырабе мэблі, пакуль выпускаюць паліцы для абутку. З канца мінулага года вядзецца рэканструкцыя і Ільянскай лесапільні, якую абсталявалі трыма сушылкамі, пачалі будаўніцтва цэха па перапрацоўцы дошак. Гэта і дадатковыя рабочыя месцы, і безадходныя тэхналогіі адначасова.

Адкрыццё ўчастка па выпуску паліўных гранул дазволіла наладзіць безадходную вытворчасць. Раней адходы вытворчасці, у тым ліку тое ж пілавінне, нікому не былі патрэбны, нават калгасы іх не хацелі браць за бясцэнак. Цяпер новая прадукцыя знайшла свайго спажыўца за мяжой. Акрамя таго, на прадпрыемстве аднымі з першых паставілі награвальныя катлы, што дазволіла ацяпляць вытворчыя памяшканні і цалкам забяспечваць работу вытворчага абсталявання. Для перапрацоўкі адходаў драўніны на лесапілках установілі спецыяльныя драбілкі, купілі дзве машыны, якія адвозяць трэскі на Жодзінскую цеплаэлектрацэнтраль.



Майстар Мікалай ЧАЕЎСКІ і аператар станкоў з лічбавым кіраваннем Леанід КІСЕЛЬ у цэху механічнай апрацоўкі.




Каля станка Waco, прызначанага для распілоўвання і габлявання брусоў у рэйкі.

## І на мэблю ёсць мода

На прадпрыемстве працуе больш за тысячу чалавек. А трапіць на ММЦ было заўсёды прэстыжна: добрая зарплата, выплачваецца яна без затрымак. Прычым заробкі значна большыя, чым на іншых дрэваапрацоўчых прадпрыемствах. А прадукцыя прадпрыемства вядомая і карыстаецца попытам у многіх краінах блізкага і далёкага замежжа. Асартымент яе даволі шырокі і разнастайны, штомесяц вырабляецца каля 200 найменняў мэблі. Гэта камоды, стэлажы, часопісныя і абедзенныя сталы, шафы, ложкі, спальныя гарнітуры. У 2004 годзе ўпершыню з'явілася прадукцыя для дзіцячых і падлеткавых пакояў у разнастайным аздабленні і камплектацыі.

Спачатку пастаўлялі мэблю на Захад, былі сярод спажыўцоў і такія «экзоты», як Малайзія, Кітай, Японія, Аўстралія, Англія, Амерыка. Але самыя вялікія пастаўкі ішлі ў Германію і Францыю, затым — Аўстрыю, Данію. Словам, зона ахопу — уся Еўропа. Апошнім часам пераарыентаваліся на Расійскую Федэрацыю, з якой да гэтага часу не кантактавалі. У рабоце з краінамі-суседкамі таксама ёсць свае плюсы: тут жывуць людзі са славянскім, блізкім да нашага менталітэтам.

Мода — вельмі капрызлівая дама. На мэблю яна таксама мяняецца. Таму трэба мець, як той казаў, добры нюх, каб не прагарэць, пастаянна вывучаць попыт і кан'юнктуру рынка. Напрыклад, Цэнтр выпускаў мэблю, пакрытую лакам, якая разыходзілася на «ўра». Але ў 2003 годзе Захад адмовіўся ад яе, паколькі мода на яе прайшла. Кіраўніцтва прадпрыемства як бы прадчувала новыя тэндэнцыі на мэблевым рынку і закупіла дзве новыя аддзелачныя лініі, што дало магчымасць таніраваць вырабы і пакрываць іх белым воскам. На сённяшні дзень прыкладна каля 60 працэнтаў яе ідзе ў белым воску. Такія вырабы вельмі падабаюцца заходнім пакупнікам і расіянам.

Сапраўды, каб пастаўляць прадукцыю на экспарт, трэба быць канкурэнтаздольным, пастаянна працаваць над павышэннем якасці прадукцыі. На прадпрыемстве ўкаранёна сістэма якасці IKEA-4SIP, а таксама міжнародная сістэма якасці Еўрасаюза REACH.

Выпускаць мэблю, якая не саступае аналагам замежных вытворцаў, дапамагае менавіта пастаяннае аснашчэнне прадпрыемства новым сучасным абсталяваннем. За гады існавання ММЦ яго вытворчыя магутнасці павялічыліся ў дзясяткі разоў.

УНП 600003222

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ і з архіва прадпрыемстваў.**

# І цёпла, і даўгавечна!

**Адкрытае акцыянернае таварыства «Радашковіцкі керамічны завод» — вядомае ў нашай краіне і нават за яе межамі прадпрыемства па выпуску сценавых керамічных матэрыялаў. Завод ажыццяўляе выпуск як традыцыйнай керамічнай цэглы розных відаў, так і керамічных парызаваных, у тым ліку буйнагабарытных, блокаў з такімі спажывецкімі вартасцямі, якія дазваляюць гаварыць аб камфорце, эканамічнасці, экалагічнасці і даўгавечнасці. Наогул Радашковіцкі завод першым у Беларусі пачаў выраб парызаваных керамічных матэрыялаў, і сёння гэты від прадукцыі ўжо цяжка назваць новым, паколькі ён вельмі актыўна выкарыстоўваецца ў будаўніцтве самых розных аб'ектаў. Зараз прадпрыемства імкнецца нарошчваць вытворчасць якасных і недарагіх высокарэнтабельных, энергазберагальных матэрыялаў, замацоўваць доўгатэрміновае і прадукцыйнае супрацоўніцтва, дабівацца яшчэ большага росту фінансавага прыбытку.**



Якасць прадукцыі ААТ «Радашковіцкі керамічны завод» пацвярджаюць шматлікія ўзнагароды і граматы, атрыманыя ў выніку ўдзелу прадпрыемства ў розных выставах і конкурсах. З узнагародамі і прадукцыяй знаёміць галоўны тэхнолаг Наталля КАРНЯЙЧУК.

## Самы аўтаматызаваны

Рашэнне аб будаўніцтве завода па вытворчасці керамічнай цэглы ў г.п. Радашковічы было прынята яшчэ ў 1981-м, што было звязана з вострым дэфіцытам керамічных будматэрыялаў у першую чаргу на будоўлі сталіцы. Першая прадукцыя была выпушчана ў 1984-м. Высокую якасць і прывабную каляровую гаму цэглы адразу высока ацанілі і будаўнічыя арганізацыі, і насельніцтва. Аднак пасля распаду Савецкага Саюза завод рэзка скараціў аб'ёмы вытворчасці. Быў закрыты адзін з двух цэхаў.

— Першапачаткова працавалі два цэхі, у адзін з якіх было пастаўлена абсталяванне французскай вытворчасці, а ў другі — італьянскай, — расказвае дарэктар ААТ «Радашковіцкі керамічны завод» Алег МІШЧАНКА. — Калі ў 1990-я аб'ёмы будаўнічага рынку моцна скараціліся, цэх з італьянскім абсталяваннем давялося закрыць. Частку абсталявання тады перадалі дзейнаму цэху. Дагэтуль у нас працуе толькі адзін цэх...

З 2002 года завод перажывае сваё другое нараджэнне. Пры падтрымцы Прэзідэнта і Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва была праведзена газіфікацыя прадпрыемства, мадэрнізацыя і рэканструкцыя тэхналагічнага абсталявання. Перавод вытворчасці на газ дазволіў значна знізіць затраты і павысіць якасць прадукцыі. Усё гэта плюс нізкі кошт зрабіла прадукцыю завода канкурэнтаздольнай на ўнутраным і на знешнім рынках. Каб выйсці на еўрапейскі ўзровень вытворчасці сценавых матэрыялаў, на ААТ «Радашковіцкі керамічны завод» распачаліся работы па ўкараненні ў вытворчасць парызаваных вырабаў. Масавая вытворчасць такой керамікі пачалася ў 2004 годзе.

— Завод выпускае керамічныя сценавыя матэрыялы метадам пластычнага фармавання на французскай лініі па вытворчасці керамічнай цэглы фірмы «CERIK», — удакладняе Алег Сяргеевіч. — Гліну набываем у ААТ «Керамін», кар'ер якога размяшчаецца на адлегласці 15 км ад нашага завода. Летась было выпушчана ўжо 64,5 млн умоўных штук цэглы.

У межах адпаведнай дзяржпраграмы ў 2007-2010 гадах была праведзена мадэрнізацыя прадпрыемства. Уведзена ў дзеянне кагенерацыйная газапоршневая ўстаноўка, якая дазваляе атрымліваць электрычную і цеплавую энергію. Цеплыня выкарыстоўваецца для тэхналагічнага працэсу, скажам, для сушкі цэглы, а электраэнергія — для патрэб завода ўвогуле. Гэта ўстаноўка амерыканскай вытворчасці магутнасцю 0,75 МВт. Набыццё сваёй мініэлектрастанцыі дазволіла, па сутнасці, знізіць кошт электраэнергіі прыкладна ў 2 разы.

Было закуплена і абсталяванне, якое дазволіла наладзіць выпуск буйнафарматных парызаваных блокаў. Гэта блокі фарматаў 4,4 НФ, 9 НФ, 14 НФ, якія досыць шырока сёння прымяняюцца ў будаўніцтве. Такія блокі валодаюць палепшанымі цеплатэхнічнымі вартасцямі, добрай гукаізаляцыяй і дазваляюць паскорыць сам працэс будаўніцтва за кошт свайго вялікага памеру...


Дырэктар ААТ «Радашковіцкі керамічны завод» Алег МІШЧАНКА
Скончыў Беларускі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт па спецыяльнасці «Хімічная тэхналогія тугаплаўкіх неметалічных і сілікатных матэрыялаў», Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці «Эканоміка і кіраванне вытворчасцю». Працаваў на ААТ «Мінскі завод будаўнічых матэрыялаў», спачатку рабочым, пасля майстрам, старэйшым майстрам, начальнікам цэха. У 2009 годзе прыйшоў на ААТ «Радашковіцкі керамічны завод» у якасці дырэктара.

Летась прадпрыемства завяршыла мадэрнізацыю аддзялення абпалу. Старыя зводавыя панэлі тунэльнай печы былі заменены на арыгінальныя французскія. Толькі ўстаноўка новых панэляў дазволіла атрымаць эканомію газу да 4 працэнтаў. Напрыканцы мінулага года прайшоў і конкурс сярод патэнцыйных пастаўшчыкоў вакуум-прэса для фарміравання керамічных вырабаў. Выйграла адна нямецкая кампанія. Да канца лета плануецца ажыццявіць замену вакуум-прэса, які ўжо састарэў і не забяспечвае патрэбнай якасці. Замена прэса павялічыць вытворчасць працы, паколькі дазволіць перайсці з 24-гадзіннага на 16-гадзінны рэжым працы. Акрамя таго, палепшацца якасныя характарыстыкі прадукцыі — марачнасць і марозаўстойлівасць.

На гэты год запланавана ўвядзенне тэхналагічнай лініі па вытворчасці вогнетрывалых вырабаў. Лінія дазволіць забяспечыць уласную патрэбу прадпрыемства ў вогнетрывалых вырабах, адмовіцца ад набыцця імпартных камплектуючых. У перспектыве вырабы такога кшталту можна будзе выпускаць і для продажу. Да канца года плануецца зманціраваць гэтую лінію і ажыццявіць яе эксперыментальны пуск.

У планах на 2014 год — набыццё і ўвядзенне ў эксплуатацыю аўтаматызаванага комплексу для ўпакоўкі гатовай прадукцыі. Сёння мае месца ручная ўпакоўка, што, вядома, менш прадукцыйна. У 2015 годзе будзе завершана мадэрнізацыя аддзялення абпалу — заменена газагарэлачнае абсталяванне, устаноўлена сістэма аўтаматызацыі тунэльнай печы, што, у сваю чаргу, дазволіць сэканоміць яшчэ да 5 працэнтаў газу для абпалу цэглы, а таксама палепшыць якасць выпускаемай прадукцыі. Можа пашырыцца і каляровая гама. Зноў жа, яшчэ крыху палепшацца такія характарыстыкі, як марачнасць і марозаўстойлівасць.

— Мадэрнізацыя прадпрыемства на гэтым не спыніцца, паколькі гэта той працэс, які павінен працягвацца пастаянна, — кажа Алег Мішчанка. — Абсталяванне, тэхналогіі павінны рэгулярна абнаўляцца для паляпшэння вытворчасці працы, якасці прадукцыі, росту заработнай платы. Мы штогод удасканальваем тэхналагічныя працэсы і сёння з'яўляемся адным з самых аўтаматызаваных прадпрыемстваў сярод прадпрыемстваў па вытворчасці цэглы ў Беларусі. Гэта дазваляе зніжаць затраты на вытворчасць, а таму ў нас — самы нізкі кошт на керамічную прадукцыю ў краіне.

Замена абсталявання дазваляе зніжаць і колькасць работнікаў. Сёння на заводзе працуе 290 чалавек. Для аб'ёму вытворчасці ў 65 млн умоўных штук у год гэта, можа быць, і зашмат, аднак у завода ў пасёлку ёсць яшчэ свой магазін з гаспадарчымі і харчовымі таварамі, два інтэрнаты, сталовая, нарэшце, транспартны цэх, які забяспечвае дастаўку сыравіны на прадпрыемства, падачу сыравіны з запасніка на тэхналогію, дастаўку гатовай прадукцыі заказчыку. Працуе рамонтна-механічны ўчастак, энергетычная служба. Тым не менш, нават пры такой вялікай колькасці работнікаў выручка на аднаго чалавека складае цяпер амаль 40 тысяч долараў, а да 2015 года лічба павінна вырасці да 71 тысячы...

— ААТ «Радашковіцкі керамічны завод» — не экспартна арыентаванае прадпрыемства, — кажа намеснік дырэктара камерцыйны Канстанцін САЛАГУБ. — Прадукцыя завода недарагая, сабекошт лагістыкі дасягае 45 працэнтаў. Таму вазіць цэглу далей як за 100 — максімум 200 км няма ніякага сэнсу. Выпуск падобнай прадукцыі ва ўсім свеце арыентаваны на мясцовае спажыванне. У іншых краінах кожны рэгіён мае сваё прадпрыемства для забеспячэння неабходнымі будматэрыяламі «сваёй» тэрыторыі. Тым не менш, за мінулы год 27 працэнтаў прадукцыі было пастаўлена на экспарт. Галоўным чынам, у Маскву і Маскоўскую вобласць. Менавіта экспарт дазволіў выканаць тыя планы па мадэрнізацыі, якія мы перад сабой паставілі. Усё ж такі мы імкнёмся набываць абсталяванне лепшых вытворцаў, так што нам патрэбны валютныя сродкі...


Аператары Андрэй ДВАРЭЦКІ і Павел ТЫЛІНДУС на адным з участкаў цэха вытворчасці цэглы.


Вядучы інжынер аўтаматызаванай сістэмы кіравання вытворчасці Уладзімір ЗАРОЎСКІ.


Аператар Уладзімір ВАЯДЗІЛАЎ працуе на ўчастку ўпакоўкі гатовай прадукцыі.

## Парызаваная кераміка. Толькі плюсы

Прадукцыя ААТ «Радашковіцкі керамічны завод» выкарыстоўваецца на такіх аб'ектах, напрыклад, як «Чыжоўка-Арэна», будынак Нацыянальнага алімпійскага камітэта, новы будынак музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама на аб'ектах сацыяльна-культурнага прызначэння, пры будаўніцтве школ, дзіцячых дашкольных, медыцынскіх устаноў. Аднак асноўная доля вырабаў накіроўваецца на жыллёвае будаўніцтва.

Новае слова ў будаўніцтве — парызаваная кераміка. Яе прынцыповае адрозненне ад звычайнай заключаецца ў структуры матэрыялу. Сучасная тэхналогія дазваляе ствараць пустацелы керамічны камень з мноствам драбнюткіх пор. Таму шчыльнасць каменя і яго вага меншая, а цеплыня захоўваецца пры гэтым лепш. З'яўляецца магчымасць вырабу буйнафарматных блокаў, якія па памеры істотна адрозніваюцца ад звычайнай цэглы. Адзін такі блок можа замяніць 15 штук стандартнай цэглы. Інакш кажучы, парызаваныя блокі могуць перавышаць памеры цэглы ў 15 разоў. Яны значна больш эканамічныя пры вырабе. Напрыклад, эканомія газу і электраэнергіі дасягае 25 працэнтаў. Блокі на 30 працэнтаў лягчэй за звычайную пустацелую цэглу і пераўзыходзяць яе па паказчыках цеплаправоднасці ў 2 разы. Пры выкарыстанні істотна павялічваюцца тэмпы кладкі. Словам, парызаваная кераміка — гэта нізкая цеплаправоднасць, высокая гукаізаляцыя, здольнасць ствараць у памяшканні спрыяльны мікраклімат, аптымальны вільготны і паветраны абмен, што дазваляе сценам «дыхаць». А таксама — даўгавечнасць.

*Сцяна той жа цеплаправоднасці, але складзеная з парызаванага матэрыялу, можа быць у 2 разы танчэйшай за тую, што выканана са звычайнай цэглы.

*Адпадае неабходнасць у дадатковай цеплаізаляцыі. Акрамя таго, змяншэнне вагі сцен прыводзіць да спрашчэння канструкцыі фундамента, які становіцца на 10-15 працэнтаў танней.

*Трываласць блокаў дазваляе будаваць шматпавярховыя будынкі з апорнымі сценамі.

*Высокая марозаўстойлівасць парызаваных блокаў дазваляе прымяняць іх у любых кліматычных умовах і складае не менш за 50 цыклаў.


Начальнік цэха вытворчасці цэглы, старшыня назіральнага савета Уладзімір КАРТАШОЎ кажа: «У нас няма сур'ёзнай цякучасці кадраў. Людзей задавальняе праца — добрая заработная плата, добрыя графікі, наяўнасць інтэрната».

*** У 2006 годзе тэхналогія вытворчасці парызаваных сценавых матэрыялаў атрымала дыплом як «Лепшая тэхналогія года».**
*** У 2007 годзе керамічныя пустацелыя парызаваныя блокі атрымалі дыплом «Прадукт года».**
*** У 2006 і 2007 гадах завод атрымліваў узнагароду «За дасягненні ў будаўнічай галіне Рэспублікі Беларусь».**
*** У 2008 годзе дыплом «За дэманстрацыю энергазберагальнай прадукцыі» атрыманы на міжнароднай рэспубліканскай выставе «Будпрагрэс».**
*** У 2009 годзе ААТ «Радашковіцкі керамічны завод» узнагароджана дыпломам «Лепшая навацыя года» ў галіне будаўніцтва.**
*** ААТ «Радашковіцкі керамічны завод» — лаўрэат конкурсу «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь».**
*** У 2008, 2010 і 2011 гадах керамічныя парызаваныя пустацелыя блокі заваявалі званне «Лепшы будаўнічы прадукт».**
*** У 2011 годзе — лаўрэат конкурсу «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі». Завод быў таксама прызнаны лепшай кампаніяй года на міжнародным форуме інавацыйных жыллёвых праектаў у Маскве.**


Аператар цэнтральнага пульта кіравання Міхаіл ЛАЎНІКОВІЧ.

### Канкурэнтныя перавагі

Вытворчасць асноўнага аб'ёму керамічнай цэглы ў Беларусі ажыццяўляюць 6 прадпрыемстваў з няспынным цыклам вытворчасці. Ёсць і нязначная колькасць невялікіх мясцовых цагляных заводаў.

— Асноўнай нашай канкурэнтнай перавагай з'яўляецца тое, што завод першым асвоіў выпуск керамічных парызаваных блокаў і сёння вырабляе шырокі асартымент гэтага будаўнічага матэрыялу, — кажа Алег Мішчанка. — Мы робім стаўку на нізкі сабекошт, адмысловую якасць гатовай прадукцыі і шырокі асартымент. Мае значэнне і лагістыка. У нас ёсць свой аўтатранспарт для дастаўкі вырабаў на аб'екты заказчыкам у зручны для іх час і дзень.


Начальнік бюро тэхнічнага нагляду Таццяна БАРАНОЎСКАЯ і інжынер-тэхнолаг Зінаіда КАЗЛОЎСКАЯ ажыццяўляюць перыядычную праверку гатовых вырабаў на паглынанне вады, наяўнасць вапневых уключэнняў, марозаўстойлівасць. Кантроль вядзецца не толькі ў дачыненні да гатовых вырабаў, але і на розных этапах вытворчасці.


Трыццаць гадоў працуе на прадпрыемстве загадчыца пункта аховы здароўя Ганна УЛАСАВА. У бліжэйшы час плануецца набыць вітамінныя комплексы для ўсіх работнікаў. У сакавіку можна будзе прайсці флюараграфічнае абследаванне. У пункце ажыццяўляецца і перадрэйсавы агляд, і перыядычна — алкатэст.

Ідзе пагрузка гатовай прадукцыі.



Святлана БАРЫСЕНКА.
Алена ДАЎЖАНОК.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

УНП 600077710

■ Ні хваста і ні лускі

# ГАЛОЎНАЕ Ў РЫБАЛЦЫ — НЕ РЫБА...



**Падымацца задоўга да світання, цягнуць груваcткія прылады і цэлы дзень сядзець на марозе — што прымушае аматараў рыбалкі ісці на такія «подзвігі»? Як высветлілася, зусім не рыба.**

## ПЕРАТВАРАЮСЯ Ў РЫБАЧКУ

Я ўстала а палове сёмай раніцы, каб праз гадзіну ўжо ехаць у камфортным «Сітраене» да Мінскага мора. Там мусілі адбыцца спаборніцтвы па зімовай рыбалцы сярод рыбаловаў-аматараў. Са мной былі мой колішні аднакласнік, заўзяты рыбалоў Арцём ды Віктар — мужчына сярэдніх гадоў, таксама аматар рыбалкі і па сумяшчальніцтве кіроўца.

Ехалі цёмнымі яшчэ дарогамі, блукаючы ў прыцемку па лесе. Хлопцы разважалі пра рыбалку. «Я чакаў чаго заўгодна, толькі не Мінскага мора, — скардзіўся Арцём. — Справа ў тым, што месца рыбалкі арганізатары паведамлялі за некалькі дзён да спаборніцтваў — такія правілы. — Там рыба капрызная, яе пашукаць трэба».

Я не стала высвятляць, чаму капрызіць рыба на Мінскім моры, бо мы ўжо прыехалі на месца. Навокал з машын выходзілі мужчыны ў поўнай рыбацкай амуніцыі, камбінезонах і куртках, выцягвалі з багажнікаў буры і спецыяльныя скрыні на рамянях. «Зараз я цябе апрану — будзеш сапраўднай рыбачкай!» — заявіў Арцём, дастаючы для мяне мужчынскія гумовыя боты на шнуроўцы, камбінезон і куртку «пад мілітары». «Затое не змерзнеш,» — запярэчыў ён у адказ на мой недаверлівы погляд і нясмелае «можа, не трэба?..» Зрэшты, боты сорак другога памеру аказаліся на дзіва лёгкімі і даволі ўтульна (на колькі магчыма так казаць) падышлі на мой трыццаць шосты. Камбінезон я вырашыла ўсё ж не апранаць, прыхапіўшы толькі неабдымную і сапраўды вельмі цёплую куртку.

## А РЫБАК РЫБАКА...

Усе віталіся, размаўлялі — сапраўды, як заўважылі пазней арганізатары, як вялікая рыбацкая сям'я. Рэгістравалі пад нікнэймамі — мянушкамі, якімі рыбакі называюць сябе ў інтэрнэце. Бо і самі спаборніцтвы выйшлі адтуль, з сеціва: удзельнікаў сабраў тут рыбацкі інтэрнэт-форум. Адзін з арганізатараў, Сяргей Шалькевіч, узгадаў, як усё пачыналася: «Чатыры гады таму мы ўтрох — я, Андрэй Звагільскі і Юрый Астроўскі — былі на рыбалцы. І прыйшла ідэя высветліць, хто паміж нас лепей рыбу ловіць. Ёсць жа спаборніцтвы паміж спартсменаў, чаму б не паспрабаваць і нам, аматарам?» Вось так і пайшло: у першы раз сабралася дванаццаць удзельнікаў, потым — усё больш і больш. З гэтай аматарскай суполкі ўжо нават выйшлі прафесійныя спартсмены, якія ўдзельнічаюць у чэмпіянатах краіны і міжнародных спаборніцтвах.

Сёлета да ўдзелу было заяўлена каля пяцідзесяці чалавек. Прыехаў трыццаць адзін. Па словах арганізатараў, для зімы гэта нармальна, а вось улетку рыбаловаў спаборнічае значна больш. А ўвогуле такія спаборніцтвы сярод «не-спартсменаў» праводзяцца чатыры разы на год — у кожную пару. Таму большасць удзельнікаў ужо знаёмыя паміж сабой. Тут збіраюцца людзі рознай адукацыі, прафесій. З часам і геаграфія удзельнікаў пашыраецца: ужо не першы год прыязджаюць рыбаловы з Віцебска. «Людзі імкнуцца сюды не па ўзнагароды, — упэўнены арганізатары. — Некаторыя ведаюць, што не атрымаюць перамогу, але ўсё адно едуць. Рыбалка — гэта хвароба. І стасункі. Бо самае цікавае пачнецца пасля спаборніцтваў: будзем гатаваць юшку, размаўляць».



Першы ўлоў.

## ЛАВІСЯ, РЫБКА!

Арганізатары нагадалі правілы: не перашкаджаць адзін аднаму, не дзяліцца ўловам, не ўжываць алкаголь. Пасля прасігналіў гудок старту... Пайшла і я, і, калі снежны наст праваліўся пада мной і я амаль па калена апынулася ў вадзе, што сабралася падчас нядаўняй адлігі, па-сапраўднаму ацаніла свае непрамакальныя боты.

Як я памылялася, думаючы, што рыбалка — гэта калі шмат гадзін сядзіш на адным месцы, і баішся паварушыцца! Рыбакі забегалі па лёдзе, як спартсмены падчас эстафеты: запрацавалі буры, узрываючы лёд і выштурхоўваючы на паверхню фантаны вады. На свідраванне лунак давалася ўсяго гадзіна, і трэба было паспець зрабіць дастатковую іх колькасць, пазначыўшы кожную аранжавым сцяжком з напісаным на ім нікнэймам удзельніка. Пасля бурэння кожную лунку трэба было «прыкарміць» — закінуць па жменьцы матыля. А потым — хадзіць і правяраць паклёўку, перыядычна падкормліваючы ўяўную пакуль што рыбу. «Усё залежыць ад гульні», — тлумачыў мне Арцём, асцярожна варушачы вудай над лункай.

...Час ішоў марудна, кожныя дзесяць хвілін здаваліся гадзінай. Арцём распавядаў мне пра «фішкі», на якія ў прамым і пераносным сэнсах бярэ рыба. Час ад часу даносіліся покрыкі рыбакоў: «Што ў цябе?» — «Ды так, пара акунькоў, а ў цябе?» — «І ў мяне з пяток будзе». Суддзі зрэдку прыносілі звесткі: недзе ўжо больш за дзясятак плотак выцягнулі. Але шанцавала не ўсім: нехта не злавіў яшчэ ніводнай рыбкі.

Так мінулі чатыры гадзіны лову, падчас якіх, бегаючы ад лункі да лункі, Арцём вывудзіў каля дзясятка маленькіх акунёў. Нарэшце прагучаў фінішны гудок, і арганізатар Юрый Астроўскі вывез на возера чорныя пластыкавыя сані. «Для майго ўлову і саней не хопіць!» — пажартаваў нехта з рыбакоў. Кожны ўдзельнік падыходзіў з мяшком, у які складваў рыбу, адзначаўся ў спісе і атрымліваў нумар, які таксама клалі ў мяшок. Рушылі на бераг.

## ДЫК ВОСЬ ДЛЯ ЧАГО СЮДЫ ЕЗДЗЯЦЬ!

На паляне трэці арганізатар, Андрэй Звагільскі, ужо ва ўсю чараваў над сапраўднай рыбацкай юшкай, што булькатала і пускала густую духмяную пару ў вялікім катле на агні. Людзей на паляне значна паболела: на юшку падцягнуліся цэлыя сем'і рыбакоў з жонкамі і дзецьмі.



Пераможца спаборніцтваў Андрэй Герасімчук.

Сяргей Шалькевіч дастаў электронные вагі і пачаў узважваць кожны пакуначак. Высветлілася, што пераможца, якім аказаўся Андрэй Герасімчук, налавіў адзін кілаграм сто дзесяць грамаў рыбы, а агульная вага здабычы склала каля пяці кілаграмаў. Пераможца раскрыў мне сакрэт паспяховай рыбалкі: каб злавіць рыбу, трэба як мага больш рухацца, шукаць яе. «Я вельмі рады, што мне ўдалося дасягнуць вяршыні, — падзяліўся ўражаннямі Андрэй. — Але гэта для мяне — хобі. Ва ўсім гэтым знаходжу азарт і яднанне з прыродай».

Пасля ўзважвання — фінальнае пастраенне і ўзнагароджванне — усё, як у вялікім спорце. Пераможцы атрымлівалі ў якасці прызоў рыбацкія прылады, прыкорм для рыбы, медалі. Потым удзельнікі выстраіліся ў чаргу да катла з варывам. Пад размовы, жарты, гучанне спеваў і вершаў пачаставалі сапраўднай юшкай і мяне. І няхай яе зварылі не са свежага ўлову, але яна была такая шыкоўная — наварыстая, духмяная, апетытная, што я зразумела, дзеля чаго варта ездзіць на рыбалку. Пякучая юшка на марозе, вясёлая кампанія аднадумцаў і пачуццё задавальнення. А велічыня ўлову — гэта ўжо другаснае.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
**Фота аўтара**

■ Да ведама

## СПЫНІСЯ І ДАПАМАЖЫ

**22 лютага ў Беларусі пройдзе Адзіны дзень бяспекі руху пад дэвізам «Пакідаеш месца ДТЗ — учыняеш злачынства!»**

Тым часам у Магілёўскай вобласці шукаюць кіроўцу, які кінуў паміраць на дарозе 32-гадовага жыхара вёскі Дашкаўка Магілёўскага раёна. Паводле паведамлення ДАІ, 16 лютага позна ўвечары на шашы «Магілёў—Бабруйск» невядомы аўтамабіль наехаў на мужчыну, які атрымаў смяротныя траўмы. Вадзіцель з месца здарэння ўцёк.

— Рана ці позна кіроўцы, якія пакуль схаваліся ад пакарання, будуць знойдзены, і яны адкажуць па ўсёй строгасці закона, — каментуе інспектар аддзялення па агітацыі і прапагандзе Магілёўскай ДАІ Вольга Вяршубская. — Дарожна-транспартнае здарэнне — трагедыя і для пацярпелых, і ў большасці выпадкаў для віноўнікаў. Ад гэтага ніхто не застрахаваны. Але калі здарылася такое няшчасце, трэба ўмець адказваць за свае ўчынкі і найперш дапамагчы таму, каго вы паставілі на мяжу жыцця і смерці.

Летась у Магілёўскай вобласці зарэгістравана 61 ДТЗ, дзе кіроўцы з месца здарэння збеглі. У іх загінулі 10 чалавек і 58 атрымалі траўмы. Сёлета ўжо здарыліся 3 падобныя аварыі, і два вадзіцелі на гэты момант затрыманы.

**Ілона ІВАНОВА**

■ Анонс. Эксклюзіўнае інтэрв'ю з космасу

Алег НАВІЦКІ:

# «МОЦНАЙ» ПАЛОВЕ ЖАДАЮ БЫЦЬ... МОЦНАЙ!»

Вядомую ісціну, што чалавек да ўсяго прывыкае, пацвярджае наш беларускі касманаўт Алег Навіцкі. Акурат 23 лютага ў экіпажа транспартнага пілатуемага карабля «Саюз ТМА-06М», камандзірам якога ён з'яўляецца (і бортінжынерам — на Міжнароднай касмічнай станцыі), — чатыры месяцы з дня старту. Ажно чатыры! Нават не верыцца. У чарговы раз шчыра дзіўлюся хуткаплыннасці жыцця, у тым ліку — і на каляземнай арбіце.

За гэты час Алег, вядома, прызвычаіўся да жыцця ў бязважкасці, адмысловага рэжыму, адметнасцяў харчавання ды іншага. Прызвычаіліся і мы да стасункаў з космасам. Хто — праз электронную пошту, хто — праз тэлефонныя размовы...

Вось і я наважылася папрасіць Алега адказаць на пытанні. Па задумцы — «касмічнае» інтэрв'ю. Такога ў маёй журналісцкай практыцы яшчэ не было! Дамовіліся, што я дашлю яму пытанні па «электронцы», а ён патэлефануе і на іх адкажа. Я ж з дапамогай гучнай сувязі на мабільніку паспрабую занатаваць размову на дыктафон.

Вечар пятніцы прынёс паведамленне ад Алега: «У выхадныя запішам інтэрв'ю! Трымай дыктафон пры сабе!»...

**Падрабязнасці пра тое, як праходзіла «касмічнае» інтэрв'ю і што сказаў у ім Алег Навіцкі, чытайце ў суботнім нумары.**



Даты | Падзеі | Людзі

**1470** год — нарадзіўся Мікола Гусоўскі, беларускі паэт-гуманіст і асветнік эпохі Адраджэння. Прадстаўнік новалацінскай усходне-еўрапейскай літаратурнай школы. Атрымаў адукацыю ў Вільні, затым вучыўся ў Польшчы, Італіі. У 1518 годзе наведаў Рым у складзе дыпламатычнай місіі ВКЛ. У 1522-м па просьбе Папы рымскага Льва Х напісаў свой лепшы твор «Песня пра моц, дзікасць зубра і паляванне на яго». У кастрычніку 1523-га выдаў у Кракаве зборнік «Песня пра зубра», які складаўся з празаічнага прысвячэння каралеве Боне Сфорца (прасіў яе ўзяць пад дзяржаўнае заступніцтва таленавітых людзей мастацтва), аднайменнай паэмы і 11 вершаў. Выступаў у паэме як прадстаўнік рэнесанснага рэалізму, папулярызатар гісторыі і культуры Беларусі ў свеце. Гусоўскі першым у славянскім свеце адлюстраваў сацыяльна-палітычны крызіс у ВКЛ, крытыкаваў палітыку «шляхецкай» Польшчы і «магнацкага» ВКЛ, з абурэннем пісаў пра пакуты простага народа. Адну з галоўных прычын няшчасцяў справядліва лічыў войны. Бачыў у народнай мудрасці невычэрпную крыніцу для паэзіі. Гусоўскі — заснавальнік жанру ліра-эпічнай паэмы ў літаратуры Усходняй Еўропы, стваральнік рэнесанснага мастацкага стылю ў літаратуры Беларусі. Памёр пасля 1533 года.




**1994** год — супрацоўнікамі ЦРУ быў арыштаваны Олдрыдж Эймс, супрацоўнік амерыканскіх спецслужбаў. На працягу дзевяці гадоў гэты высокапастаўлены чыноўнік амерыканскай разведкі, які меў доступ да інфармацыі любога ўзроўню сакрэтнасці, быў агентам КДБ. Пасля таго, як расследаванне было скончана, і Эймс быў змешчаны ва ўтульную турэмную камеру, якая цяпер належыць яму пажыццёва, ЦРУ прызнала, што гэта быў самы буйны аператыўны правал за ўсе гады існавання амерыканскай разведкі. На службу да савецкай разведкі Эймс пайшоў сам — у пошуках сродкаў для выплаты даўгоў. У першым жа паведамленні ён назваў прозвішчы двух савецкіх грамадзян, якія працавалі на ЦРУ, за што адразу атрымаў першыя 50 тысяч долараў. За 9 гадоў Эймс выдаў савецкай контрразведцы некалькі дзясяткаў амерыканскіх шпіёнаў, якія працавалі ў СССР. Паслугі афіцэра ЦРУ Масква аплачвала шчодра — на момант арышту на рахунку Эймса было паўтара мільёна долараў, не лічачы раней патрачаных немалых сум — Эймс нават трапіў у «Кнігу рэкордаў Гінэса» як самы дарагі шпіён. Але шпіёну трэба ўмець разумна траціць грошы — менавіта яны яго і падвялі. Пры параўнальна сціплай зарплаце Эймс купіў дарагі аўтамабіль, раскошны дом і некалькі дарагіх карцін. Гэта не магло не прыцягнуць увагі. За ім пачалі сачыць, і неўзабаве ніякіх сумненняў не засталося — Эймс працуе на рускіх. Пакарання смерцю ён пазбег дзякуючы поўнаму супрацоўніцтву са следствам. У турме Олдрыдж Эймс, які адбывае пажыццёвае зняволенне, зарабіў яшчэ паўтара мільёна — напісаў і выдаў кнігу мемуараў.

**1947** год — нарадзіўся (горад Мазыр) Міхаіл Якаўлевіч Фінберг, дырыжор, заслужаны дзеяч мастацтваў, народны артыст Беларусі. З 1987 года — дырэктар — мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь. Прапагандуе музыку беларускіх кампазітараў. Арганізатар, мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных фестываляў. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1990), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1996). Узнагароджаны ордэнам Ф.Скарыны.

Было сказана

**Янка БРЫЛЬ (1917—2006), народны пісьменнік Беларусі:**

*«Перачытваць добрую кнігу час ад часу — усё роўна як папраўляць сабе збрую перад далейшай дарогай».*

**Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.**




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Калінінград. Нарвал. Бакас. Гіпс. Гало. Уфа. Рад. Ніша. Гармата. Ані. Любэк. Сакэ. Нагата. Засада. Лама. Бос. Абух. Язмін. Адказ. Тайм. Кал. Сайт. Бакара. Крама. Араб. Нара. Клайпеда. Скарына.

**Па вертыкалі:** Капенгаген. Гданьск. Пірог. Лак. Анабас. Ласт. Муза. Лён. Алах. Лье. Бакал. Тук. «Рэал». Рана. Кораб. Ангара. Аса. Марс. Гол. Судак. Ямб. Абак. Саюз. Аніс. Арабіка. Шок. Донар. Бандура. Эрас. Пантэра.

## СЁННЯ

### Сонца

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 8.16 | 18.31 | 10.15 |
| Віцебск | — 8.08 | 18.18 | 10.10 |
| Магілёў | — 8.06 | 18.21 | 10.15 |
| Гомель | — 8.00 | 18.20 | 10.20 |
| Гродна | — 8.31 | 18.47 | 10.16 |
| Брэст | — 8.28 | 18.50 | 10.22 |

### Месяц

*Поўня 25 лютага.*
*Месяц у сузор'і Рака.*

### Імяніны

***Пр.*** *Аляксандра, Андрэя, Захара, Сямёна, Федара.*
***К.*** *Ірэны, Элеаноры, Яўгеніі, Барталамея, Фелікса, Цэзара.*



Фота Дар'і ЭВЕРС.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Мужыкі! Перад 23-ім лютага купіце сабе пену, брытву, кубак і шкарпэткі! Пастаўце каханую ў тупік!..**

Цешча — зяцю, са злосцю:
— Хопіць чытаць газету, пайшоў бы лепш градкі паліў!
— Дык дождж ідзе, мама...
— Ну і што, апрані плашч!

**Мужыкі, памятайце: калі дамы смяюцца да слёз над вашымі тупымі анекдотамі, яны альбо беспрасветныя дурніцы, альбо вы начальнік ці халасцяк!**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 61, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 25.327. Індэкс 63850. Зак. № 832.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 20 лютага 2013 года.